

# ROCK on-line

## Вітаўт Мартыненка

**Вітаўт МАРТЫНЕНКА**

# ROCK ON-LINE

**Па матэрыялах актуальных музычных сайтаў**

Нарысы

Мінск
2010

УДК 78(476)
ББК 85.31(4Беи)
М29

**Мартыненка, В.**
М 29 **Rock on-line.** Па матэрыялах актуальных музычных Сайтаў: нарысы / Вітаўт Мартыненка. – Мінск, 2010. – 214 с.

Чарговая праца папулярнага музычнага журналіста і паэта Вітаўта Мартыненкі пераканаўча малюе карціну вострых ідэалагічных баталіяў на ніве знешне ціхага і адназначнага балота беларускага шоў-бізнэсу. Кніга хоць і базуецца на дакументальным матэрыяле, мімаволі вытрымалася ў жанры музычна-публіцыстычнага дэтэктыва (з таямнічымі доследамі, хітрамудрымі агентамі, пошукамі і знаходкамі) і адрасавана меламанам шырокага профілю ды проста аматарам адцягнуцца з беларускім томікам у руках. Сярод дзеючых герояў – музыкі папулярных гуртоў («Мясцовы час», «Ulis», «P.L.A.N.», «Камэлот», «Ростра» ды інш.), паэты, журналісты, канцэртова-выдавецкія мэнэджэры. І, як у кожным дэтэктыве, чытач не адразу, але apriori даведаецца, хто забівае беларускую песню ў Беларусі, дзе акурат лепшае ўжо не гучыць на тэлебачанні, нефарматнае на радыё.

**УДК 78(476)**
**ББК 85.31(4Беи)**

© Мартыненка В., 2010

У кнізе выкарыстаны фотаздымкі Анатоля Мяльґуя, Уладзіміра Панады, Андрэя Плясанава, Андрэя Лянкевіча.
Дызайн вокладкі – Альдона Мартыненка (з выкарыстаньнем уласнага малюнка на тыльнай бачыне).

*Кніга падрыхтавана паводле арыґінальных on-line інтэрвію музычнага крытыка Вітаўта Мартыненкі для наведнікаў форуму «Музыкальной газеты» і вэб-сайту радыё «Свабода».*

*Аўтар выказвае асабістую падзяку музыкам гуртоў* ***«Мясцовы час», «P.L.A.N.», «Partyzone», «Майzer», «žygimont VAZA», «Камэлот», «:Б:Н:», «Зьмяя», «Amaroka», «Zdań», «Тінь Сонця», «TlustaLusta»****, а таксама шчырым ды неабыякавым суайчыньнікам Зьмітру Сідаровічу, Алесю Аркушу, Анатолю Мяльґую, Сяргею Золатаву, Міколу Бранцаву, Ярашу Малішэўскаму, Віталю Супрановічу, Іне Глушаковай ды іншым, галасы якіх даходзяць нават у хвіліны найцяжэйшых расчараваньняў.*

*Андрэю Плясанаву ды Анатолю Тарасу асобная падзяка за плённыя фантазіі вакол назвы гэтае кнігі.*

*Асобны fuck you very much усім цэнтрам падтрымкі выдавецкай ініцыятывы ў Беларусі, дзякуючы якім можа пасьлізнуцца любы выдавецкі праект. А вось першым чытачам дзякую за ініцыятыву папярэдняй падпіскі.*

**Выдавецтва «Ковчег» папярэджвае**: дзеля захавання адмысловай стылістыкі інтэрнэт-дыскусіяў у кнізе захаваны мова, правапіс і лексіка ўсіх яе ўдзельнікаў.

# Гадзючнік навыварат

Чалавечы досьвед напрацаваў нямала мудрых выслоўяў і алеґорыяў, сэнс якіх... згублены праз самапэўную мудрасць нашчадкаў[1]. Напрыклад, што для вас сымбалізуе папулярны вобраз гадзючніка? Таго самага гадзючніка, пра які сьпяваюць вам нават найпапулярнейшыя рок-куміры: "N.R.M.: Хай варожыць гадзючнік варожы,/Усё роўна мы пераможам!".

Так, кожны здагадваецца, што гаворка пра нешта непрыемнае й варожае чалавечай істоце... Але, параіўшыся хаця б з сваймі бацькамі, адчуйце яшчэ больш ганебную сутнасць гадзючніка: рэч у тым, што гадзюка, нарадзіўшы кубло нашчадкаў, адразу пачынае іх паядаць, і выжываюць толькі тыя, якія пасьпеюць адпаўзьці далей. Так што як бы ні варажыў гадзючнік, ён варожы ўжо сам сабе, таму не перамагчы яго проста немагчыма. Але ці не стварыла нашае беларускае грамадзтва нешта адваротнае гадзючніку? І адваротнае – ня ў сэньсе станоўчае, бо нашыя нашчадкі гадзючага кубла ня толькі самі нясмачныя для Радзімы-маці праз уласную чужасць ёй, але й па нараджэньні гэтак жа прагна пачынаюць яе кусаць.

Гэты вопыт таксама мае гістарычныя паралелі. Памятаеце біблійную леґенду пра Хама? Бо Хам жа – ня проста нявєтлівы чалавек, а няўдзячны нашчадак сваіх бацькоў. У бібліі Хам праславіўся як сын, што прылюдна сьмяецца з натуральных патрэбаў свайго бацькі, забываючыся, ці сам жа не такі. Дый хіба мала ў нас падобных сьмехуноў?

Мы не зьбіраемся займацца груваcткімі абагульненьнямі, а хочам разгледзець праблему на прыкладзе найбольш даступным масавай аудыторыі – поп-культуры. Дзесяцігодзьдзямі нам даводзілі, што гэта нешта нявартае, чым ня трэба сур'ёзна займацца, бо важней – культура высокая, клясычная. У выніку мы сталіся першым народам, дзе ў сфэры маскульта працьвітае татальнае чужацтва, а высокая культура... засталася толькі ў

[1] Ну вось колькі прыгажунь намагаецца перакарміць мужыка дзеля прымаўкі "Шлях да сэрца мужчыны ляжыць праз ягоны страўнік"! Кормяць, кормяць, а ў выніку толькі серца,.. якое нават кот закопвае. Між тым, нашыя прапрамамкі ведалі, ШТО падкласьці мужыку ў боршч, каб яму хацелася, калі ёй хочацца, і каб не прыставаў, калі яна ня можа. Вось яны валадарылі сэрцам, а ня серцам! Дык што там з іншымі прымаўкамі ў тых, хто не марнуе сэнс традыцыяў?

мёртвых музэйных сховішчах. Знайдзіце яшчэ хоць адну такую краіну, дзе, як у Беларусі, песьня на роднай мове зьяўляецца нефарматнай на ўсіх тутэйшых радыёстанцыях. Прычыны, якімі абґрунтоўваецца законнасць такой тактыкі, найневерагоднейшыя: акрамя розных надуманых "чорных сьпісаў", пра якія ведаюць усе, хоць яны то ёсць, то няма, варта памятаць і яскравы прыклад гурта "zIGZAG", калі ратацыя сьвежых песень альбому "Bionic@" пачалася толькі пасьля таго, як вакаліст перасьпяваў беларускія вакалы на english – і кажэце пасьля гэтага пра адмысловыя крытэры якасьці.

Якія мэты падобнай тактыкі? Гэткія ж дзіўныя ды нявыгадныя менавіта тытульнай культуры краіны, як і тыя тлумачэньні прычын: толькі Беларусь ня мае ніводнага маскульт-фэсту, дзе паўнакроўна б панавала родная мова ("БАСовішча" ня ў лік, бо яно было створана за межамі Беларусі напрыканцы 80-х акурат як пратэст супраць здушэньня нацыянальнай ідэі менскага фэсту "Тры колеры", а сёньня ў журы й арґкамітэце "БАСоў" расьсяваюць свае мэтастазы тыя, хто акурат і нішчыў нацыянальную ідэю "Трох колераў"), толькі ў Беларусі бяз зьверкі прапіскі ў пашпарце ня знойдзеш дыск беларускага артыста ў сэкцыі "Отечественные исполнители" нашых жа музычных крамаў.

Красамоўна апісаныя крыніцы тае тактыкі ў клясычнай нашай літаратуры. Узяць хоць бы ўлюбёнага аўтарам гэтай кнігі пісьменьніка Кастуся Акулу, які ў сваёй бліскучай трылёґіі "Гараватка" пакінуў жывую схэму імпэрскага стаўленьня да паняволеных: "Чужнікі, быццам таўкачы ў ступе, заўсёды адно таўклі (і таўкуць): вы – пагной для тых, што над вамі пануюць, вы – хамы да нічога ня здатныя, адно цяглавая сіла"[2]. Гэта пра народ, які даў сьвету адзін зь першых дэмакратычных зводаў законаў "Статут ВКЛ", народ, зь якога выйшлі Анна, каралева Францыі (унучка Раґнеды), адсюль жа й заснавальніца роду Ягелонаў Соф'я Гальшанская…

І такое руйнаваньне нацыянальнага духу не зьяўляецца выпадковасьцю ўжо і ў сфэры маскульта. Гэта вынік сьвядомай працы пэўных колаў, што нібы хамелеоны перафарбоўваюцца пад любыя актуальныя лёзунґі, а насамрэч самааддана нясуць праз жыцьцё вернасць каляніяльнай ідэі: "Нацыяналісты

---

[2] *Цытуецца паводле выданьня:* Кастусь Акула "Гараватка": кніга 3-я "Беларусы, вас чакае зямля", (Toronto, выдавецтва "Пагоня"/"Greenwood Ltd.", 1981, стар. 75).

праклятыя, мовы роднай захацелі, маразматыкі чортавы. У маскульце абы якасць была, дык і тое ганарыцца можна!" – чуем мы мэтадычна аднастайныя стандартныя высновы. І ня толькі ў чужамоўных СМІ.

Як вы мяркуеце, ці выпадкова "Наша ніва", адзіная беларуская ґазэта з прэтэнзіяй на нацыянальна-прарочы статус, вядзе гаворкі пра нацыянальны маскульт толькі ў зьедліва-зьдзеклівай форме, хоць камэнтатары часам мяняюцца (і калі асобнаму камэнтатару выпадкова не спадабаўся якісьці пэўны гурт – "P.L.A.N." або "Тарпач", – яшчэ куды ні йшло, але мэтодыка кпінаў замест аналізу выкарыстоўваецца там і да такіх сымбалічных нацыянальных маскультпраектаў, як "Я нарадзіўся тут", "Беларускі музычны архіў", больш простых "Вольных танцаў")[3]? Таму што Іваны Сусаніны ёсць у кожным нацыянальным асяродку.

Вунь нават у сьціплай рэпрынтнай ґазэтцы "Моладзь БНФ" не абыйшлося без сьлядоў аґентуры маскоўскага ўплыву, і акурат у пытаньнях маскульта: "Гурт АББИОТУРА... Няма словаў, Масква. Упэўненасць трыманьня на сцэне проста непараўнальная!", – піша ў адным зь лістападаўскіх нумароў 2007 году нейкая Надзея Н. (ну проста НН, стрыечнае дзіцё "Нашай Нівы") у сваім рэпартажы з фэсту "Рок-Кола". І ніякіх сур'ёзных крытэраў, аказваецца, ня трэба: адно слова – Масква! І не бяда, што ніводзін прыхільнік гуртоў кшталту EVANESCENCE або клясычных METALLICA ці LED ZEPPELIN нават не зразумее, пра што гаворка. Чаму? Ды акурат бо адно слова – Масква. Там ніколі не было ўзораў выдатнай тэхнікі гуказапісу або неверагоднай сцэнаґрафіі, а проста спробы па-

---

[3] Аўтар кнігі прынёс нам апошні асобнік "Нашай нівы", на якім калісь разьвітаўся з ґазэтай назаўжды – "НН" №7, 12.02.2001. Тут зьмешчаны рэцэнзіі на CD "Ластаўкі ў стрэсе" Міхася Забэйды-Суміцкага ("сьпявак любоўна выконваў беларускія музычныя творы, не зважаючы на недасканаласьці некаторых зь іх"), "Толькі сон" Алена ("навошта фінансаваць гэты ўбогі, сіроцкі палёт творчае фантазіі за кошт і без таго ня дужа багатай эміґрацыі"), супольны праект "Я нарадзіўся тут" ("замала песень, задужа гарніру; перш за ўсё фотаздымкаў, у якіх увасобілася неверагодная самазакаханасць нашых музыкаў"). Станоўчы водгук рэцэнзэнта-самахама атрымаў толькі невменяемый чужынскі праект кшталту "20 супер-хитов, рождённых в Беларуси" ("BULBA RECORDS здолела ўсяго за год... У адрозьненьне ад... яна арыентуецца на музыку папулярную... І праекты выдавецтва незаўважанымі не праходзяць, бо яны дастаткова прадуманыя і камэрцыйна асэнсаваныя"). Ну і дзе тая бульба і тыя 20 "камэрцыйна прадуманых" хітоў сёньня, хто іх памятае? Няйначай "сучасная НН – гэта навіны з адваротнай краіны".

дылетанцку скапіяваць заходніх куміраў у рок-музыцы. Але ж нават апазыцыйнае выданьне "Моладзь БНФ" заклікае арыентавацца не на лепшых, а на Маскву. На тую самую Маскву, дзякуючы якой беларус ужо тры стагодзьдзі сумняваецца, ці трэба яму будаваць уласную хату.

Каб ня склалася ўражаньне, што мы заклікаем у кожнай музычнай рэцэнзыі тупа крычаць "Бі маскалёў!" (а такі стэрэатып і падсоўваюць нашым вядучым крытыкам, каб потым абвінаваціць у маразму), варта прывесьці ў контрпрыклад цьвярозы разважлівы аналіз таго ж самага канцэрту вядомым нацыянальным музыколяґам Анатолем Мяльґуем у "Музыкальной газете" №42 за 15 лістапада таго ж году: "Своеасаблівым адкрыцьцём для беларускіх слухачоў стаў выступ расейскага гурта АББИОТУРА (Масква/Растоў-на-Доне), музыкі якога выконвалі рэдкі на расейскай рок-сцэне ethnocore. Адна зь іхніх песень была прысьвечана Беларусі".

Чаму такога цьвярозага нацыянальнага кантэксту не прапаноўваюць тыя, хто мкнецца ў лідэры нацыі? Чаму чужыя цэнзары падсоўваюць зьбітыя арыентыры? Мо проста каб захаваць цеплыню асабістых наседжаных мейсцаў палымяных барацьбітоў, у якіх нічога не палучаетца. А ў выніку...

Вы хочаце выйсьці зь цемры чужога лесу (і лёсу), а чакае вас адно – чужое невядомае балота. Калі без алеґорыяў: чакае вас статус адной з заштатных вобласьцяў Расейскай Фэдэрацыі, куды то паліва ўзімку забудуць прывезьці, то верталёты ў павадак ня змогуць даляцець на дапамогу, то хлеб з "закромов родины" ня здолеюць падвезьці ў галадуху, бо ўсё згніло... А то во яшчэ – карпатліва будуць класьці асфальт усю зіму, каб увесну ён сплыў у павадак на хвалях талага лёду, пакінуўшы на лета традыцыйныя калдобіны... І потым усе мы будзем слушна наракаць "пра дуракі і дарогі", а нават не задумаемся ніколі, што вінаватыя мы самі. Мы, якія аддалі ключ ад сваёй хаты чужынцам. Нібыта Біблію забыўшы: "...і нават на ўрадлівай зямлі галадаць будзеце вы, аддаўшыя сьвятыню псам". А ключ наш, наша сьвятыня – наша мова. Ці адчыняецца наша хата нашым ключом? Не, пакуль толькі чужым.

Ня варта доўга разважаць над абстракцыямі, бо многае выявіла праведзенае "Музыкальной газетой" інтэрвію зь вядомым беларускім журналістам Вітаўтам Мартыненкам, які разам з Анатолем Мяльґуем быў і сярод стваральнікаў першага нацыянальнага рок-клюбу "Няміга" ў 1984, першага нацыянальнага рок-фэсту "Тры колеры" ў 1986, першых "БАСовішчаў" у

1990, першых нацыянальных гіт-парадаў у 1991. Але й тут адзін занадта шчыры Сусанін (гл. эпіґраф да кнігі) рызыкнуў яго, гэтае інтэрвію, назваць адкрыта – цкаваньнем, ці траўляй па-іхняму, у якой прынялі ўдзел і "вялікія" дзеячы (анты)нацыянальнай музжурналістыкі, якія менавіта ў нацыянальных крыніцах інфармацыі займаюцца адно высьмешваньнем нацыянальных куміраў, падсоўваньнем зьбітых крытэраў каштоўнасьці. Карацей кажучы, дактары, якія выпісваюць пурґен ад кашлю, а то й кулю ад галаўнога болю, чым і "ўмацоўваюць" свой аўтарытэт. Мы ня будзем тут увекавечваць імёнаў сучасных ґерастратаў, бо яны хоць і хаваюцца пад ананімнымі нікамі, бачныя зацікаўленым людзям. А калі й не, дык важней тут сама праблема, а не імёны ейных апаляґетаў.

Гэтае інтэрвію не было траўляй асабіста Мартыненкі, як лічыў ён сам. Гэта ўжо традыцыйнае цкаваньне нацыянальнай ідэі, якое адбываецца ў Беларусі пад шыльдай клопату (а як жа йначай) пра якасць айчыннай культуры. Але вынікам таго клопату стала толькі хвароба беларускага грамадзтва. І найдзіўнейшым сьведчаньнем тае хворасьці гледзеліся ў той час... шчырыя віншаваньні Вітаўта ў нацыянальных суполках з пасьпяховым змаганьнем ("малайчына, вы там усіх параскідалі, як шмацьцё"), калі яму так патрэбен быў асабісты ўдзел аднадумцаў у гэтым фарсе.

Фарсе? Ці можна так назваць звычайную акцыю "Музыкальной газеты", рэдактара якой Алега Клімава (О'К) многія паважалі менавіта за здольнасць абстрагавацца ад палітычных амбіцыяў і асягнуць практыку аб'ектыўага аналізу? Прынамсі мейсцамі, бо зусім не цьвярозы аналіз, а нешта наўзор даносу пакінуў ён тады ў публічнай дыскусіі парталу "Тузін гітоў":

(О'К 05.09.2008 у 09'47, пост №11444: Думаю, Помидору будет небезынтересно, – сцьвярджае ён, прапаноўваючы спасылку на "Белгазету", – что о некоторых его песнях думают идеологически близкие ему "господа". Если поднять интернет-архивы, наверняка обнаружим, что в дни той трагедии эти "люди" кричали об ответственности властей и покаянии. Мрази).

Гаворка ідзе пра абмеркаваньне ў выдавецкіх колах песьні Аляксандра Памідорава "Крывавае сьвята"[4], якая нібыта павінна выклікаць тыя ж эмоцыі, што і траґедыя, даўшая падставы для

[4] Гл. CD-альбом супольнага праекту "Я нарадзіўся тут" (Мн., "Boutique Kamila", 2000, трэк. 19). Шматкроць перавыдаваўся.

твору. Клімаў, які тут лямантуе "об ответственности властей и покаянии", а потым стане журналістам "привластной" ґазэты "Советская Белоруссия", адпрэчвае чыёсьці права на самастойную думку, хоць сам чуў тую думку толькі ў перsuccesses іншых даносчыкаў. Дадамо, што Памідораў усё ж трапіў у той праект "20 гадоў – 20 гітоў" (трэк 14), але з іншай песьняй – "Быць беларусам" (CD "Сьвята пакрадзена", трэк 6).

Пэўная тэндэнцыйнасць Клімава прасочваецца і ў красамоўных ўводзінах да тых інтэрвію, якімі намагалася падняць тыраж канаючая "Музыкальная газета":

О'К для всех 08.11.07 у 14'36: Сергей Будкін – известнейший музжурналист, один из "тузінцевгітов", один из организаторов последних "Рок-Коронаций", "Басовищ" и т.п.

(Пасьля такіх словаў ніхто б і не зьдзівіўся, каб Сярога апынуўся й несьмяротным аўтарам Бібліі ды нават Талмуда, да якіх ён мае гэткае ж дачыненьне, што й да пералічаных рэґальляў).

А вось іншы прыклад:

О'К 24.10.07 у 15'50: Прошу задавать вопросы. Витаут готов на них ответить. Кто первый?

(А тут, відаць, сустрэча пойдзе зь нейкім безыменным хлопчыкам, пра якога й сказаць няма чаго. Толькі чаму ж за ТЫДЗЕНЬ сустрэчы з гэтым інкоґніто пытаньняў прыйшло ў 75 разоў болей за пампезна адрэкамэндаваную славутасць, і ў два разы – за месячны рэйтынґ самога О'К? Ці ня вечная тут спроба падмены аўтарытэтаў? А мо Клімаў проста ўспрымае Мартыненку – пра яго й гаворка ў другім прыкладзе – як "Mercedes" беларускай музычнай журналістыкі, катораму рэкляма непатрэбная? Бо ўжо праз паўтара месяцы ў іншай публікацыі – адным з аглядаў новых дыскаў – А. Клімаў недвухсэнсоўна напісаў: "Тэксты песень тут належаць леґендзе беларускай журналістыкі В. Мартыненку", гл. "МГ" №46 за 13 сьнежня 2007 году, стар. 2).

Дык вось вам поўны тэкст акурат інтэрвію з Мартыненкам, пра мэты й вынікі якога кожны здолее сфармаваць меркаваньне сам. Адно, мы папрасілі Вітаўта пакінуць на пэўных найбольш вострых момантах свае камэнтары. І першае, што стала такім камэнтаром, была наіўная Вітаўтава падзяка Алегу Клімаву, што ягоны тэкст быў разьмешчаны ўсё ж пад рубрыкай "О газете", калі Будкін – пад рубрыкай "Трёп". Пэўна, насамрэч невыпадкова. Бо на думку аўтара С. Будкін – выразна падстаўная фіґура на полі барацьбы шавіністычных і нацыянальных прыярытэтаў у незалежнай краіне

Беларусь (Вітаўт называе яго дваюрадным сынам Д. Падбярэзскага, які фіґураваў на гэтым он-ляйне пад рознымі мянушкамі).

Сваімі дыспутамі ў музычным інтэрнэце ды ўласным досьведам В. Мартыненка намагаецца пераканаць чытача: усюды, дзе паяўляюцца Д. Падбярэзскі, Д. Безкаравайны, М. Івашын, С. Будкін, В. Дарашэнка ды ім падобныя – сканчаецца беларуская песьня (хіба толькі за выняткам калгас-фольку). Не адразу, але непазьбежна (хоць прыходзяць яны часам з роднай мовай да беларусаў). І мо сапраўды, калі прыгледзецца да прыведзеных арґумэнтаў, так было ў ґазэце "Наша ніва", на радыё "Свабода" і, здаецца, цяпер гэты хаўрус гадаванцаў з братняй Тулы, Саратава й Караґанды дацягнуўся й да "БАСовішча" ды дэмакратычных інтэрнэт-парталаў. Але гэта наўрад ці голы папрок аўтара ў бок так званых "инородцев", бо менавіта ён, як і ўся нацыянальная плынь беларускага маскульта, цёпла сустрэлі тут Зьмітра Бартосіка зь Ніжняга Ноўгараду, гурты "Rima" і "Zero-85" зь Беластоку, "Яблоко" і "Athruta" з Пэтэрбурґу, Данчыка зь Нью-Ёрку. Гэта проста выснова з пільнага аналізу мэтаў і вынікаў дзейнасьці дзеячоў маскульта.

Калі на вачах пэўны эўрапейскі этнас зь вялікай гісторыяй губляе рэшткі прыкметаў нацыянальнай культуры, дык таму мусіць быць важкая прычына. Прычына сітуацыі, калі, па словах клясыка, "быў час, быў век, была эпоха /…/ калі другі артыст народны ня знаў і двух народных слоў,/ Затое меў тут харч нязводны ды ўволю цешыўся з аслоў"[5].

Бадай, калі ня раз тут цытаваны пісьменьнік Васіль Якавенка слушна заўважае: "Столькі зямлі тут ды такая ў ёй жыватворная сіла: ткні калом – вырасьце дрэва", дык мае падставы й на парадаксальны водгук знакаміты бард Віктар Шалкевіч: "Якая тут зямля! Якая сьера! Ўсадзі ў яе зярнятка, выйдзе чэлес, устане, праз хвіліну ападзе"[6]. Дык хто ж аслы тут, зь якіх цешацца бязмозґлыя народныя артысты, што валодаюць роднай мовай толькі цераз слоўнік, а чэлес усё адно ападае, бо "на глебе ўрадлівай народ

[5] *Паэма Ніла Гілевіча цытуецца паводле першага афіцыйнага выданьня:* Вядзьмак Лысагорскі "Сказ пра Лысую гару", Мн., выдавецтва ЦК КПБ, 1988, стар. 44.

[6] *Цытуецца паводле выданьняў:* Васіль Якавенка "Пакутны век" (Мн., 2009, "БелСаЭС Чарнобыль", стар. 122) і Віктар Шалкевіч "Добрай раніцы" (Мн., 2002, "БМAgroup", трэк 19 «Каапэратыў "Сучка, ўнучка і палучка"»).

галадае"[7] – скуль такія вынікі ў іх? Мо з галадухі яны вымушаны былі эканоміць на вывучэньні роднай мовы, каб магчы потым латвей выпрошваць міласьціну ў багатых суседзяў? Але ж Бог пакуль ратаваў нашыя землі ад татальнай засухі, патопу, землятрусу. А мы ўсё ж здрадзілі роднаму слову, якое ў чалавечай цывіліхацыі паўсюдна шануецца за вышэйшую сьвятыню – дзеля чаго? Адказ напрошваецца даволі просты: сярод нас занадта многа або здраднікаў, або акупантаў. Іншай прычыны няма, цьвердзіць Вітаўт Мартыненка. Бо нармальныя людзі патрабуюць слоўніка хіба ў замежных мовах, а роднай мовы не цураюцца нідзе й ніколі.

Не выпадкова ж на пытаньне карэспандэнта Польскага радыё Ганны Гарачка 22 лістапада 2007 году Вітаўт Мартыненка сказаў: "Чаму расейскамоўная папса пераважае ў беларускім радыёэтэры? Дык ці ж не таму, што маскультам займаюцца ў нас не беларусы, а людзі, якія папрыяжджалі сюды з Тулы, Караґанды, Саратава, Варонежа... Выконваючы всказівку Пуціна не шкадаваць сродкаў на вяртаньне расейскай мовы ў нацыянальныя ўскраіны імпэрыі, яны й засыпаюць татальна нашу сьвядомасць чужым прадуктам, забясьпечваючы марґінальны фон для шпарчэйшага распаўсюду чужацтва, ды навязваюць хлусьлівыя крытэры ацэнкі творчай якасьці. Такія крытэры, каб беларус свайго ад чужога ня мог адрозьніць. Гэта тонкія гульні вялікай імпэрыі, што ў нас пад бокам" (гл. спасылку ў сеціве на старонцы Польскага радыё http://www.polskieradio.pl/zagranica/news/artykul70094.html).

Такім чынам, чытайце ды рабіце слушныя высновы. А галоўнае, яшчэ раз паўторым, не забывайце біблійнае: і на ўрадлівай зямлі галадаць будзеце, калі аддасьцё сьвятыню псам. Дык не аддавайма ж!

*Ад выдаўцоў*

---

[7] *Цытуецца паводле CD-выданьня:* Альбом "Зьніч надзеі" гурта "P.L.A.N." (Мн., 2006, "БМAgroup", трэк 6 "Успамін пра будучыню").

# Интервью с Витаутом Мартыненка

**Форум «Музыкальной газеты».** http://www.nestor.minsk.by/mg/forums/2007/10/240501.html (**В.М.:** *ужо не працуе: татальна зьнішчаны без залучэньня ў архіў, бо такая тактыка – пёрднуць і схавацца, тыцкаючы ананімным пальцам з завугольляў у невінаватых*[8]).

***О'К (31.10.2007; 10'34); Пост №8065:*** Где все-то?

***Шум (31.10.2007; 11'29); Пост №8066:*** Все теперь гадят на форуме «Музыкальной газеты» – травят там Виктора Мартыненко...

*Гасьцёўня «слушнага» музычнага парталу «Тузін гітоў»*[9].

Можа, гэта мне здаецца, можа гэта толькі сон,
Не сьпяваецца, ня п'ецца, быццам трапіў у палон.
На сваёй зямлі чужы я, роднай мовай грэбую.
Абкружылі, аблажылі, але хто — ня ведаю.

*Алесь Наркевіч «Памяркоўныя цяляты»*

---

[8] У рэпліцы В. Мартыненкі выкарыстана інтэрпрэтацыя цытаты з маштабнай трылёґіі Васіля Якавенкі "Пакутны век" (Мн., 2009, "БелСаЭС Чарнобыль", стар. 137): "Хаім Вайцман з Моталя абвесьціў вайну Гітлеру і зьбег кудысьці, далей ад Жэнэвы! – Іншымі словамі пёрднуў і схаваўся за вугал? – Але ж наш Моталь і выкарміў-такі Напалеона Хаіма!"

[9] Можна было б і адрас даць, але чытач, бадай, і сам знойдзе, дзе ўступіць у гаўно беларускае. А каб спадар Шум (ён жа Віталь Дарашэнка) не ўяўляўся занадта шчырым і адкрытым чалавекам («Шум 04.11.07, 22'42 ...Попробуйте доказать, что Шум и Дорошенко – одно и то же лицо»), прывядзем яшчэ адзін ягоны tuzin-post, дзе ён адкрыта абяцае за міску супа зьняважыць хоць родную мамку: «Шум 14.09.2008, 22:58 Пост №11480 – Реклама на сон грядущий: Товарищи и соратники по балде. Третий день перебиваюсь с супа на чай. Исхудал. Ищу работу. Можно разовую, можно удалённую. Универсал в издательском деле: вёрстка, дизайн, редактура, могу писать, и ДАЖЕ НА ЗАКАЗ – БЕЗ МЫЛА, НО ЗА БОЛЬШИЕ ДЕНЬГИ. СВОБОДНО ПЛАВАЮ В ИНТЕРНЕТЕ: админить-редактировать-писать – запросто. Надоело голодать, будут предложения – кричите: shymy@list.ru, ICQ 263582193». Варта дадаць, што пасьля таго пачалося нестрыманае цкаваньне дзеячоў нацыянальнай культуры Беларусі на шэрагу музычных сайтаў, арґанізаванае шэфам «Тузіна» Анатолем Лазарам (ён жа Вецер Мэханічны, ён жа ВМ, але ня Вітаўт Мартыненка).

# Здаровы пачатак

**О'К 24.10.07, 15'50: Прошу задавать вопросы. Витаут готов на них ответить. Кто первый?**

**Сяржук 24.10.07, 16'36:** ***Не надоело ли ещё об одном и том же... столько лет-то?***

**Витаут Мартыненка 24.10.07, 16'54:** Сяржук, а что если я отвечу вопросом на вопрос: не надоело ли вам об одном и том же... столько лет-то? Я ведь ещё в школе, в 1975, слушал наставления от директриссы: "Битломан несчастный, не надоело ещё? Вот окончишь школу, и вся эта псевдомузыка твоя выйдет сама вон из башки". Вот и вы туда же. У директриссы хоть на правах старшего и более опытного человека было чему меня поучить, а вы... Что тут скажешь? А не надоело ли "Nazareth" приезжать в Минск после смерти? А не надоело ли Кастанеде писать свои книги? Сколько Бог отмерил, столько и будет. Но факт, что я отношусь к рок-журналистике не как ко временному студенческому увлечению, в отличие от некоторых коллег (или калек, ибо звучит всё равно одинаково). А вы, если так не любите рок (ведь ждёте, когда он надоест), то читайте журнал "Вожык" – он как раз для тех, кому всё надоело. Там, говорят, даже уголок юмора собираются открыть. Кстати, лично меня радует, что пишу я как раз не об одном и том же: даже "222 альбомы беларускага року" – это совсем не "Праз рок-прызму", где в белорусском аспекте было с десяток героев, а остальное – временное увлечение теоретизацией...

**Сяржук 24.10.07, 17'50:** ***Ну вот так сразу... Я же с иронией, а вы по-серьёзному. Рок люблю и белорусский рок в частности... От "Вожыка" чё-то не прёт*** (**В.М.:** *А я там нават часам друкуюся, і зусім нядаўна гэроі аднаго з маіх фэльетонаў у сёлетнім №8 прыходзілі з новай кнігай "222" па аўтоґраф. Во як бывае!*)***... А вот те же "222 альбомы беларускага року" я, наверное, одним из первых приобрёл, ещё до откликов в "Музыкальной газете"*** (*1996 – 2007, зямля ёй пухам, –* **В.М.**)***. Это практически моя настольная книга, я туда, кстати, автографы музыкантов собираю (если вы не против)... и поэтому очень уважительно отношусь к вашей персоне... Но есть вопросы: 1) Вы сразу начинали с музыкальной журналистики или был период, когда приходилось писать про: урожаи и надои, дураки и дороги?.. 2) Кто был вашей первой жертвой? Исполнитель***

***или группа, которую вы покритиковали или похвалили... Первый музматериал о ком?***

**В.М. 24.10.07, 19'17:** Сяржук, извините за резкость, но она тоже с долей иронии. Скорее для других, которые это прочтут, которые всерьёз считают, что "музычны журналіст – гэта студэнт-гуманітарый, які па сканчэньні вучобы наядаецца гэтай кухняй". Так вот пишут о нас национальные СМИ. Точнее те в них, кому давно хочется, чтобы у белорусов не было своей масскультуры и серьёзных её аналитиков. У меня кардинально иное мнение. И, пожалуй, у Анатоля Мяльгуя. Потому-то мы и посвятили этой теме всю свою жизнь, и даже ни разу не пожалели об этом. Даже о том, что многие, не только вы, используют наши книги для коллекционирования автографов. Ведь классно, когда книгу можно не только читать, но и пополнять реликвиями. Тем более, белорусскими реликвиями.

А теперь номерные ответы:

1. Музжурналистику я начал с дипломной работы в университете "Рок-музыка: критерии критики". На неё уговорила меня профессор искусствоведения Е.Л. Бондарева в 1981 году, когда я уже подал в деканат заявку на тему "Реклама как вид журналистики". Я работал тогда в Белорусском агентстве по торговой рекламе редактором. Но реально, какая там журналистика – врать народу, что без жвачки у вас выпадут волосы вместе с перхотью, зубы вместе с кариесом и печень вместе с циррозом... О надоях и урожаях писать мне вообще не довелось, поскольку в университете хорошо далось ремесло макетирования газет, чем я и занимался в свободное от рок-н-ролла время. Впрочем, немузыкальные материалы в моей практике тоже бывали: публицистика, сатирические фельетоны, дорожные заметки. Но это как стилистический тренинг, для себя, а не по служебной обязанности. Хотя, в 1991 году я стал первым корреспондентом радио "Свабода" (тогда ещё в Мюнхене), который сам отказался от псевдонима. А делал я там весьма острые политические репортажи. Ну и полчаса в месяц у меня было на первый белорусский хит-парад, которых вышло с полсотни выпусков.

2. Я горжусь тем, что моя статья "БОНДА на сваім месцы" (1986) названа в некоторых справочниках первым упоминанием легендарного названия БОНДА в прессе (http://www.slounik.org/153693.html). Кстати, Ворошкевич тогда сетовал, что я опередил события, и группа СТУДИЯ-7 ещё не определилась с переменой имени. Но я выжил. Как и БОНДА, кстати. И как раз с БОНДАЙ связан мой первый журналистский курьёз: в те самые минуты, когда

меня вызвали на ковёр в ЦК ЛКСМБ для проработки по поводу статьи о якобы "дворовой группе", её перепечатки вышли в минской многотиражке "Автозаводец" (тираж 10 000) и вильнюсской "Komjaunimo tiesa" (в литовской и русской версиях).

А перед тем у меня был серьёзный разбор группы СУЗОР'Е. Для этого я долго разговаривал с Владимиром Пучинским, который доказывал мне, что рок на белорусском языке невозможен. Только фольклор. Короче, я их потоптал, когда они уже чуть ли не госколлективом стали, за что на меня впервые и взъелся один местный музыкально-партийный авторитет (привет, Д.П.). Ну ды досыць, затрыньдзеўся я...

**В.М. 25.10.07, 17'43:** Сяржук, минул день, и я неожиданно вспомнил свою реально первую музыкальную статью – о британской группе "Manfred Mann's Earth Band". Она важна для меня самой причиной появления: тогда, в конце 70-х, когда не было даже клуба филофонистов, мы, меломаны, собирались во дворе Белорусского Дома Грампластинок и обсуждали последние рок-публикации: «О, а "Ровесник" про PINK FLOYD написал! А в рижской "Советской молодёжи" читали о группе SIPOLI? Могу ксеро достать. А что ж это наша "Рабочая смена" то RAINBOW обдрыщет, то KISS фашистами назовёт? А своей музыки так и вообще вроде как нет».

Помню, Володя Бельтюков, рабочий с радиозавода, поучал меня: «Витя, ну ты же знаешь, в какой стране живёшь. Здесь между строк читать надо. Ну где бы ты прочитал биографию группы KISS? А так их обсирают для того, чтобы факты изложить. Сам же журналистом готовишься стать, знаешь, что пишешь одно, а публикуют другое». Я отвечал, что про KISS спокойно читаю в польских газетах (без идеологического вранья), а сам врать ради доставки фактов никогда не буду. А Володя: «И ничего у тебя не выйдет». Мы даже поспорили, и я загорелся желанием написать статью о какой-либо западной рок-группе без традиционных совдеповских помоев. Кстати, мой «Manfred Mann's Earth Band» вышел в газете «Знамя юности», тираж которой тогда был 700 000 экз., и удивил даже того Бельтюкова: «Ну, Витёк, я реально проспорил, за мной должок». Но он-то не знал, что было у меня и разочарование, поскольку в печать попало лишь треть моих рассуждений, да и после я, как отъявленный битломан, получил втык от редакции, где проходил практику как студент факультета журналистики Белгосуниверситета. С газетой «Знамя юности» у меня тогда не сложилось, хоть первую нашу книгу («Праз рок-

прызму», куда как раз и попал тот мой дебют, стр. 34-37) через 10 лет они представили весьма приветливо[10]. Зато «Чырвоная зьмена» сама предложила свои площади, и даже просила искать единомышленников, первым из которых оказался Анатоль Мяльгуй, с которым мы сделали реальную революцию в душах местного населения.

**Сяржук 25.10.07, 17'49:** ***Когда вышла ваша книга "222 альбомы беларускага року", я решил попробовать сделать рецензию в своей местной газетёнке, ну чтобы народ привлечь, в этом же материале я рассказывал и о книге "Іх МРОЯ, іх N.R.M." Как вы относитесь к этому сочинению Виктора Дзятликовича, нет ли сожаления, что о самой знаковой белорусской группе написали не вы?..***

**В.М. 25.10.07, 18'35:** Кстати, с удовольствием почитал бы вашу "газетёнку", а может даже и газету, поскольку в моей коллекции уже несколько десятков разных публикаций о "222", но все собрать не удаётся. Да и поток рассуждений не останавливается, хоть прошёл целый год, даже больше. Не далее как неделю назад серьёзный анализ некоего Георгия Чигиря опубликовала популярная газета "Народная воля" (см. №165-6 за 17.10.2007 либо в сети http://nv-online.info/index.php?c=ar&i=6347). В публикации "Місіянэры беларускасьці", конечно, комплименты подчас убивают анализ, но она приятная для нас с Анатолем положительным посылом. Правда, сам знаю традиции советской редактуры: автору особенно не дают порезвиться мыслишкой, заменяя всё привычными шаблонами. Но всё же поистине здорово, когда тебе сообщает об этом врач при посещении поликлиники ("А не про Вас ли эта статья? Вас там так превозносят!"). Да и концептуальные выводы всё-таки есть там.

А самый идеальный текст про наши книги мы нашли о первой у mr Gerald Paul-Foley в каком-то канадском журнале 1992 года (он хранится и у меня дома, и у Супрановича, нашего менеджера). Это был просто учебник для дальнейшей дороги в рок-журналистике. Полный перевод этого текста с английского (36 000 знаков) я думаю опубликовать в своей подготовленной уже книге "Пошукі ідыліі", но когда она выйдет, если в этой стране даже издателей нет, кроме упомянутого Супрановича, отчего рынок наполняется макулатурой от всех, у кого вместо

---

[10] Гл. "Знамя юности" №107 за 03.06.1990, стар. 1: А. Кроза "По секрету всему свету: о белорусской рок-музыке читают на Западе", фота С. Брушко.

таланта есть нечто более "важное" – деньги (в коммерческих структурах) и связи (в государственных)...

А что касается книги Виктора Дзятликовича, то я даже рад, что нашёлся человек, у которого хватило таланта написать такую монографию, и денег, чтобы её издать. Читая его "Іх МРОЯ, іх N.R.M.", я не только переживал заново былое, но даже и открывал новое. Правда, знаю, что есть и очень обиженные люди. Меня тоже не всё устраивает в этой книге: нас с Мельгуем автор подал там вообще как людей, которым всё чересчур легко удавалось (пришли, мол, два журналиста, написали письмо на фирму "Мелодия", и у белорусской рок-группы вышел диск; а мы-то десятки статей написали на тему спасения белорусской фонографии в подмосковском раю), но та книга – реальное культурологическое событие. По ней ещё фильмы снимать будут, если, конечно, Беларусь вернётся на здоровую европейскую дорогу, каковой мы, литвины, уже хаживали в нашей истории. Кстати, Виктор Дзятликович подарил мне экземпляр своей книги с таким автографом: "Чалавеку, які пісаў пра беларускі рок мо і цікавей, з павагай". Это тоже, видимо, комплимент, но приятный своим автономным посылом. Ведь мы лично даже не встречались ни разу, и Виктор никак не зависим от меня, чтобы излишне льстить. А всё остальное о книге Дзятликовича я высказал в своих рецензиях на неё для "Музыкальной газеты" (№32, 25.08.2005) и нью-йоркского ежемесячника "Беларус" (№515, 15.12.2005), так стоит ли повторяться... Всё можно легко найти в интернете.

Да и не согласен с вами, что "о самой знаковой белорусской группе написали не мы", поскольку все альбомы "N.R.M." проанализированы в нашей с Анатолем книге "222 альбомы беларускага року". Да и про "Мрою" мы писали ещё в своём американском томике "Праз рок-прызму".

**Сяржук 26.10.07, 09'52:** ***Хотел было спросить, ну когда же выйдут долгожданные "Пошукі ідыліі" и где можно достать первую вашу книгу "Праз рок-прызму"... Но по ходу уже получил ответы на эти вопросы...***

**В.М. 26.10.07, 10'20:** Очень рад, что вы внимательно читаете все мои ответы участникам он-лайн интервью, не встревая в чужую перепалку при случае. В книге "Rock on-line" они будут разбросаны тематически, но ответы и о "Пошуках ідыліі", и о "Праз рок-прызму", думаю, вы найдёте здесь тоже.

**Сяржук 31.10.07, 17'23:** ***Гляжу, напряжение первых дней уже спало у всех (*****В.М.:** *Глядзіце водгук у эпіґрафе, датаваны тым*

*самым днём)*... ***Позволю себе ещё один вопросик задать: Витаут, вот вы посещаете разные концерты, презентации и другие музыкальные мероприятия, вас там знают в лицо, пропускают и даже приглашают, а что делать начинающим?.. Хотелось бы посетить всё, да деньга не позволяет... Как можно получить аккредитацию? На "БАСы", на "Рок-Кола", ну... надеюсь, вы поняли, а то под конец рабочего дня моя извилина устала...***

**В.М. 31.10.07, 18′47:** Хороший вопрос. Могу поделиться собственным опытом: когда в студенчестве не хватало денег, я старался быть полезным тем, кто проводит концерты – помогал разгружать аппаратуру, писал предварительные пресс-релизы, приносил их организаторам и просил помочь с проходом. НО... Никогда не стоит выпрашивать и клянчить. А то сядут на шею, и будете писать под диктовку. Тогда журналиста из вас не получится. Самое святое правило успешной жизни: за всё нужно платить. Чем можешь. Как в еврейском анекдоте: "Как достичь успеха в чайном бизнессе?" – "Заваркі не шкадуйце!!!" Как можно получить аккредитацию? Для начала свяжитесь хотя бы с Супрановичем, станьте ему полезным, и попадёте на все его концерты (контакты найдёте на всех его афишах). Да и все нужные контакты – на соответствующих афишах. Но кредитов начинающим не дают, помните. Тем более, что есть журналисты, которые активно посещают презентационные фуршеты, а потом и строчки (хотя бы критической) не напишут. Мне так вообще стыдно за таких, поскольку меня отец научил, что позорнее всего быть подобным шакалом.

# Паглыбленьне ў тэорыю

**Pets 25.10.07, 05′36:** ***Здравствуйте, Витаут. Вы сказали: «А если так не любите рок, то читайте журнал "Вожык"...» У меня сразу возник вопрос: что вы вкладываете в понятие "рок"? Что это – стиль жизни или музыки, жанр, образ мышления? И почему его надо любить?.. Чем для вас "рок" отличается от эстрады, к примеру, от качественной поп-музыки (или некачественной), от инструментальной***

***или авангардной музыки?.. Как вы отличаете – что рок, а что нет?..***

**В.М. 25.10.07, 16′51:** Почему рок надо любить? Лучше обсудим: почему надо? Если "не надо", то это просто иной тип людей. Я встречал немало тех, которые слушали рок, слушали, пока это было модно, а потом ушли в "Крыжачок". Это тоже жизненный выбор. И такое же расслоение идёт в модном теперь рэпе. Лично я другой, поэтому лучше нахожу контакт с теми, кому это надо – любить рок. Да и все эти новомодные течения типа эмо, грандж, хардкор суть интерпретации рок-волны, а не соул, кул, фри-джаза, лидийского лада или других карликовых ответвлений, где шлифуется форма, а содержание игнорируется. Но я бы не повторял банальное: рок не любить – всё равно что детей не любить... Конечно, ограниченное русское понятие "любить" не уточняет, что лучше: любить рок или женщину. Но белорус поймёт, что рок можно любіць, а жанчыну – кахаць. В том и разница. И одно другому не мешает.

А философствовать, что такое рок, долго не имеет смысла, т.к. вы и так перечислили весь банальный реестр определений. Можно лишь повторить, что рок прежде всего одно из направлений популярной музыки, выросшее из стиля рок-н-ролл. А от эстрады рок отличается тем же, чем и от академической музыки или от бананов. Это просто разные вещи.

Лучше всех когда-то сказал Роберт Плант ("Led Zeppelin"): "Рок – это фольклорная музыка современности". Тогда стоит выяснить, что такое фольклор? Ошибнутся те, кто считает, что это архаичные песни наших бабушек. Отнюдь. Ведь изначально содержание фольклора определено полноценным трудовым поколением, а не стариками, посему фольклор – это прежде всего интуитивное отражение реальности социально активной личностью. Как и рок. Просто сменилось несколько поколений инструментов, поэтому данную функцию взял на себя рок. В общем, тема эта бесконечная. Но!..

Качественная музыка, некачественная... Это ботва для FM-форматчиков, потому что можно некачественно отражать реальность и что-то нести людям, а можно качественно щекотать медведю яйца, но это уже чисто потребительский разговор. Чтобы вы поняли до конца, ответьте себе на вопрос: что вам лучше подать к обеду – качественное говно или некачественный хлеб, если другого выбора нет?

**Pets 25.10.07, 17'23:** ***Спасибо за ответ. Но меня не столько волнует вопрос – надо или не надо любить рок, как то, "что это – рок"... И я не совсем понял это из ваших пространных объяснений... Т.е. сначала вы утверждаете, что рок – разновидность популярной музыки, и всё дело в корневом течении – рок-н-ролл (*****В.М.:** *Шкада, калі людзі насамперш звужаюць тлумачэньні сумоўцы замест спробы зразумець іх*)... ***Но под это определение попадает подавляющее большинство современной гитарной музыки – вы не находите?.. Если же строить философию рока на том, что это "фольклорная музыка современности", то мне хотелось бы уточнить – о какой современности Плант говорил – своей, 30 с лишним лет назад, или о нашей сегодняшней современности? А под определение "фольклор – это интуитивное отражение реальности социально активной личностью" и "содержание фольклора определено полноценным трудовым поколением" легко попадает, например, "шансон", который уж никак нельзя назвать родственным року явлением... Так в чём же тут соль?.. Вы, как видный музыкальный критик, наверняка решили для себя этот вопрос, помогите разобраться и мне.***

**В.М. 25.10.07, 18'11:** Pets, чтобы ответить вам, придётся заняться схоластикой. Замените слово "рок" в своём вопросе на слово "человек": что такое человек? Ведь если его определить просто как один из биологических видов на земле, что не противоречит истине, то под это определение попадёт и свинья, и конь, и курица ("*которую уж никак нельзя назвать родственной человеку*"), а если даже сузить определение какими-то спецификациями, то с полным правом человеком можно назвать и Гитлера, и Сталина, и Багдановича... Так, дёргаясь между разными критериями, вы ищете истину? Лучше запишите в анналах своей памяти, что определение, которое нужно кардинально менять всего лишь через 30 лет, является заблуждением, а к Планту сегодня ничего ни добавить, ни убавить (разве что рэп, который тоже пытается что-то отражать, но и его не вычеркнешь из рок-течения). А что касается самого Роберта Планта, то он называл стулом то, на чём сидел, и 30 лет назад, но вряд ли суть понятия изменилась. Разве что опыт обогатился.

Тут недавно один наш славный рэпер (Амбасадар Кроў из "ЎРВ") упрекнул, что я говорил о его читанках в обзоре рок-музыки. Мол, я-то вообще не рок. А заслуженный артист Беларуси Виктор Скоробогатов, которому я рассказывал о новых

музыкальных изданиях "БМAgroup", вообще заявил, что музыка тут разве что на дисках Михася Забэйды-Сумицкого и Миколы Равенского. Ваша категоричность из той же оперы. Но… рэп был и есть продолжением развития генеалогического древа, сформированного в эпоху рок-н-ролла, а сам рок, как бы с него ни иронизировал гениальный оперный баритон Виктор Скоробогатов, является полноценным видом именно МУЗЫКИ, а не, скажем, одежды или обуви. У нас люди вообще с некоторых пор любят НЕ ПОНИМАТЬ друг друга, хотя все всё понимают. Просто повыпендриваться хочется: вот я, мол, какой оригинальный.

Кстати, скоро на польском сайте www.kamunikat.org[11] будут выставлены на языке оригинала две наших с А. Мяльгуем книги (контракт уже подписан и даже гонорар заплачен), так вот в первой, "Праз рок-прызму", есть глобальная статья о МУЗЫКЕ ТРЕТЬЕГО НАПРАВЛЕНИЯ, куда безусловно относится и рок. А ещё у меня даже была в 1986 году статья в серьёзном болгарском журнале "ЛИК" ("Литература, Изкуство, Култура"), названная "Между простото на сложното"[12]. Вот это как раз о роке, которого не сравнишь ни с лёгким пустозвонством эстрады, ни со сложными загрузками академической музыки. Он между простым и сложным. Музыка третьего направления. Фирштейн?

**Pets 25.10.07, 22'35:** ***Позиция ясна, спасибо.***

**В.М. 25.10.07, 22'40:** Это не позиция. Это истина.

# Прага асэнсаваньняў

**ж.ф. 25.10.07, 13'24:** ***Что значит "не надоело ли Кастанеде писать свои книги"? Последняя была, кажется, в семидесятых. Или Вы считаете, что "Отшельник" имеет какое-то отношение к Кастанеде?***

**В.М. 25.10.07, 17'02:** Оба-на, вот вам и литературная дискуссия… Не советую сбиваться на анализ частных аллегорий. Фраза о Кастанеде с тем же смыслом могла звучать: а не надоело

---

[11] *Заўвага для чытачоў кніжнага выданьня:* абодва названыя фаліянты даўно стаяць у сеціве й маюць салідны рэйтынґ, гл. спасылкі http://www.kamunikat.org/k_litaratura.html?pub_start=260&pubid=5143 ды http://www.kamunikat.org/k_litaratura.html?pub_start=260&pubid=5380.

[12] Гл. штотыднёвік "ЛИК" (Сафія) №37 за 12 верасьня 1986 году, стар. 16.

ли Караткевичу сажать своего Юрася Братчыка в Городне? А не надоел ли Базарову собственный нигилизм? Речь ведь просто о том, что писатель уже не станет балериной, рок-журналист – токарем или пекарем. Безусловно, если это серьёзный, а не случайный выбор, как хотелось бы Сергею Будкину (имею ввиду уже процитированное его высказывание в газете "Наша Ніва" №29 за 11 августа 2006 года о нас с А. Мяльгуем: "Зазвычай, музычны журналіст – гэта студэнт-гуманітар, які па сканчэньні вучобы наядаецца гэтай кухняй, ад якой, дарэчы, пракарміцца цяжкавата, і сыходзіць у іншыя сфэры. Журналісты Вітаўт Мартыненка і Анатоль Мяльґуй – адны з тых нешматлікіх, хто вырашыў дзяўбаць камень айчыннай музычнай культуры і надалей"). А мы ведь не долбаем камень, а просто серьёзно относимся к работе, потому и итоги есть. И не только "прокормились с этого", но и поездили по свету (Польша, Германия, Италия, Литва, Чехия, Канада, Украина, Швеция), всюду нашли единомышленников, и весьма влиятельных... Но, уважаемый поклонник Карлоса Сезара Араны Сальвадора Кастанеды, раз уж зашёл литературный разговор на музыкальном сайте, то как вы думаете отмечать в 2008-м день памяти кумира, ведь ровно 10 лет, как его с нами нет? Может, на очередной Европейский марш соберём людей? Кстати, покащунствую, но лично для меня Караткевич – фигура помощнее. Как вам его "Хрыстос прызямліўся ў Гародні"?

**ж.ф. 25.10.07, 21′24:** ***Честно говоря, не знаю, как отмечать буду. И буду ли вообще: нормальные, серъёзные люди нынче – дефицит. Караткевича не читал, но если книга стоящая, то можно попробовать; кстати, про что там? Вообще, Кастанеда сделал революцию даже в философии, показал другую сторону жизни, офигенную альтернативу. Многие люди принялись жрать кактусы, становиться воинами, однако, почти всем пришлось вернуться обратно в эту реальность. Многие даже пострадали очень сильно. Если Караткевич отразил нечто столь же интересное, то это будет здорово. Сейчас читаю книгу про "Коррозию Металла" – забавно, легко и смешно.***

**В.М. 26.10.07, 16′33:** Согласен с вами, что серъёзные люди нынче – дефицит. Но вы эту фразу словно срезали из книги, которую я сейчас читаю – "Надлом" Василя Якавенки из библиотеки исторического романа: "Нейкая супярэчлівая і неадольная сіла

цягнула іх адзін да аднаго, дый сустрэць разумнага чалавека – заўжды вялікая раскоша"[13] (это о встрече гауляйтера Беларуси Вильгельма Кубэ с новым шефом минской полиции Эберхардом Гердом). Интересно, что ответил так называемый "палач белорусского народа", предчувствовавший, что эсэсовские подонки руками московских партизан постараются убрать автора реконструкции белорусской государственности под протекторатом Третьего Рейха? А вот что: "У тутэйшых ёсць прымаўка: стары друг лепш за новых двух. Тое самае і я думаю". Автор восторженных стихов о Беларуси, видимо, хорошо знал и фольклор беларусский, и её профессиональную музыку (театры работали не чета нынешним провинциалам згнившей империи), и дух этого народа, хоть был обычным немецким чиновником времён оккупации. Так что, возможно, так было всегда: единомышленники – это дар Божий, который надо заслужить.

А насчёт Караткевича, то он ведь тоже перевернул сознание людей на века, ведь до сих пор даже рок-группы возникают, где в названиях – его герои ("Бан Жвірба", "Юрась Братчык", супольный проект "Скрыпка дрыгвы"). Да и современные песни сейчас какие: ГЛЮКІ – "Краіна пад белымі крыламі", ПСАЛЬМЯРЫ – "На Беларусі Бог жыве", P.L.A.N. – "Растуць хай дзеткі ды вучаць словы, каб Караткевіча чытаць", GARADZKIJA – "Я дыхаю адным паветрам з Караткевічам", у кого-то даже, помнится, роман "Каласы пад сярпом тваім" виртуозно обыгран... Всё это оттуда, из прозы и поэзии Караткевича. А его бессмертный роман "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" прочитал как-то с моей подачи один приятель из Забайкалья, не знавший перед тем белорусского языка, так потом замусолил мне весь восьмитомник в девяти книгах (или уже в десяти, там ведь был ещё один добавочный безымянный том).

Роман реально стоящий, есть и перевод на русский, но очень тупой – "Христос приземлился в Гродно" (чуть ли не "Скорина поехал в Ленинград"). Так что пробовать лучше в оригинале. А про что там? Вещь философская, был даже фильм в 60-х, но его чудовищно покромсала цензура, а потом и вообще запретили. Но во времена перестройки мне даже удалось пропихнуть в комсомольской прессе рецензию на видеосамиздат с этим фильмом, сделанный студией "Бе-

---

[13] *Цытуецца паводле больш позьняга, трэцяга выданьня:* Васіль Якавенка "Пакутны век (Кабала/Надлом/Гульня на згубу)", Мн., 2009, "БелСаЭС Чарнобыль", стар. 532.

рома" ("Чырвоная зьмена" № 52 за 29 декабря 1992 года). Там о том, как можно Исуса Христа сделать из любого артиста. Но не пропагандистская. Хоть подзаголовок "Евангелие от Иуды".

Кстати, первые страниц 30 будут трудноваты, а потом не оторвётесь и с концом книги (проверено на многих: все стараются вернуться назад, не дочитав до конца, чтобы ещё раз пройти путь ярких героев из команды Юрася Братчыка, и только потом углубиться в финал).

А что касается Кастанеды, побудившего многих жрать кактусы, становиться воинами, то такая бадяга началась ещё с главной книги книг – "Библии": люди ведь до сих пор малюют доброго дедушку на иконах и злых чертей с рожками в сказках, в которых сами не верят, а истина, между тем, остаётся за бортом осознания. Надо бы не от текста балдеть да иллюстрации к нему маляваць, а идею искать, как и в музыке.

**Юньев И.С. 31.10.07, 17'31: *Вы тут намекаете, что из старого шляхетского рода (ну или застенковой шляхты, которая прослойка между лаптем и ботам), поэтому и Витовтом себя провозгласили. А чего ж вы тогда так себя несдержанно ведёте, как холоп? Может, вначале надо было поучится арестократическим манерам, а потом уже себя в князья записывать? А то корона свалится*[41]*.***

**В.М. 31.10.07, 17'50:** "Вы тут намекаете" – я не намекаю, я есть! И, кстати, не Витовт, а Витаут (читать хоть научитесь, спадар Yes Джуньев). "Между лаптем и ботам" – рад вашей революционной бдительности, дорогой любитель занюхать батистовые портянки Бендера, только это уже не модно. "А чего ж вы тогда?" – вы не поймёте, ибо истинно "ведёте, как холоп", да ещё безграмотный. "Может, вначале надо было поучи***Тс***я ар***Е***стократическим манерам" – ещё один слабый намёк: арестократия – видимо, это там, где арестовывают, а мы арИстократы, от греческого слова aristokratia – власть высшего духа. А вам не дано даже грамоте кого-то научить, ибо вам самому 2 по программе начальных классов *(нагадваю вам, рускаму патрыёту, што на пытаньне "что делать?" вашая арфаґрафія патрабуе пісаць "поучиться", а калі хто й не захоча, дык ён "что сделает?" – "не научится". Вот вы и не научились, ибо либо "между лаптем и ботОм ", либо "паміж лапЦем і ботАм". Найважнейшае, што паводле памылак вы Rider ® 100%).*

**Ф для В.М. 31.10.07, 23'20:** ***О!+1.***

**В.М. для Ф 01.11.07, 08'26:** Да не надо ниаких оценок и плюсов, поскольку просто стыдно за русскую интеллигенцию в Беларуси, которая косит под академиков в своих элементарных безграмотных нападках на общепризнанные ценности. Ведь ещё никто в мире не пробовал высмеять высокие устремления душ, гордость за род свой. А вот вам и нате, пжалста!.. Вспоминаю тут

---

[41] Іронія гэтага рэспандэнта мімаволі трапіла ў яблычак, бо карона ня толькі не звалілася, але й была прызначана афіцыйна: акурат у 2007 годзе аўтарскі дуэт М&M атрымаў свой прыз на чарговай "Рок-Каранацыі" за кнігу "222 альбомы", пра што пісалі многія ґазэты, сярод якіх вылучаўся водгук Тацьцяны Прановіч, дачкі пісьменьніка Івана Чыгрынава, у штотыднёвіку "Переходный возраст" (№9, 02.03.2007). Публікацыя мела назву "Аўтары ПВ – лепшыя".

классного украинского юмориста Євгена Дудара, который в фельетоне "Да бацькі" пишет: "Раб з галавою акадэміка яшчэ большы раб, чым раб з галавою сьвінапаса, бо раб-сьвінапас такога сьвінства ня ўчвэрыць, як раб-акадэмік"[42]. Жаль, что аналитик уважения собак Антон Игонин уже не придёт защищать и "этих весьма полезных животных", свинок то бишь (или то бок, для белорусских любителей русской кальки).



Анатоль Мяльґуй і Вітаўт Мартыненка цьвёрда трымаюць сваю "Рок-Карону'2006"

**editor для Ridera 01.11.07, 08'30:** ***"Почему среди академических композиторов, исполнителей классики, оперных певцов, артистов балета и т.п. процент спившихся и ссырявшихся практически равен нулю?" – я бы не был столь категоричным... "Потому что люди пашут как волы. Когда тебе надо полдня играть этюды и гаммы, чтобы не выпасть из формы – не до бутылки!" – зато процент тех, у кого крыша поехала – о-очень высокий...***

**В.М. для всех 01.11.07, 16'40:** А вот с мнением editor для Ridera я почти полностью согласен.

---

[42] *Євген Дудар цытуецца паводле перакладу Васіля Якавенкі з выданьня:* Васіль Якавенка "Нячывельле" (Мн., 2008, "БелСаЭС Чарнобыль", стар. 24).

**ж.ф. для Ridera 01.11.07, 09'39:** ***Дело ведь не в "спившихся и сширявшихся", мировоззрение у этих людей такое. У многих гениальных людей просто рвало крышу, в том числе и актёров театра. Взять того же Чехова (не писателя, конечно), российского физика, который отказался от Нобелевской премии, Эйнштейна, который был шизофреником, Достоевского, Гоголя... На мой взгляд, всех людей, занимающихся творчеством, можно разделить на две категории: 1. Относящиеся к творчеству, как к работе (им главное "попадать в ноты", они, как правило, талантливы, но не гениальны, они не являются творческими людьми). 2. Превратившие всю жизнь в творчество, ведущие себя одинаково что на сцене, что в жизни.***

**Com для ж.ф. 01.11.07, 10'02:** Но ведь вам уже правильно указали, что у вас то Кобейн, Вишес, Мориссон, Высоцкий, Башлачёв, то Чехов, Эйнштейн, Достоевский, Гоголь. На пачку знаменитостей только один белорус (тот, из Достоева), да и то родного языка знать не хотел, хотя его коллега и современник Мицкевич, продавшись полякам, всё же оставил потомкам хоть записку на матчынай мове: "На Божым судзе ўсім у жопу будзе". Только вот зачем он сраку жопой называл? Да и хоть по-польски, про родную Литву писал-таки. А у вас, ж.ф., даже в нике светится чужой железный феликс. Вот она, национальная болезнь – здрада!

**Rider для ж. ф. 01.11.07, 11'57:** ***Насчёт всех этих деятелей и их диагнозов можно было бы и поспорить, но не здесь. Послушаем лучше Витаута.***

**В.М. для ж.ф. 01.11.07, 16'49:** Да что вы всё о "спившихся и сширявшихся", да ещё и о съехавших с катушек в аспекте творчества. Ведь так можно связать творчество с "усравшимися и усцавшимися". У многих гениальных людей просто рвало (и не только крышу), но многие могут повторить, как рвало, но не повторят гениальных произведений кумиров. Это никак не связано. Если Джим Мориссон как-то обрыгался у микрофона, и это даже сохранено на диске[43], то сие не значит, что запись любого из местных пивняков можно будет продать каким-то тиражом.

**Арв для Ridera 01.11.07, 16'52:** ***Ну что можно сказать... По-моему это какой-то закомплексованный и обиженный чуть***

---

[43] Трэк "Morisson's Lament", дзе знакамітаму ўдзельніку брытанскага гурта "Doors" акампаніяваў славуты амэрыканец Джымі Гэндрыкс, можна адшукаць у складанцы "Supersession" (2000, "Sony Music Entertainment GmbH").

***ли не на всю жизнь человек (*****В.М.:** *Да ўвагі Антона Ігоніна: заўважце, гэта зноў так вось – запраґрамавана паважліва – пра інтэрвіююемага. Няўжо не выглядае на глыбокі ўдых пры занюхваньні парцянак? Такая прага ў ананіма: не ў душу зануракца, а ў парцянкі*)***. Может, он просто-напросто догадывается, что большинство вещей, о которых он вещает, всего лишь мыльные пузыри? Поэтому и злится? Если раньше я его считал за умного человека (***як*і жах: няўжо яно мяне калісьці разумела? –* **В.М.**)***, который полностью поглощён своей идеей, который целенапрвленно гнёт свою линию, то теперь вижу, что это больше похоже на карикатуру белоруса-националиста. То несёт полную ахинею (***то неполную? –* **В.М.**)***, то что-то очень правильное подметит, то хвастаться начнёт, то вдруг говном других поливать станет. Характер – просто вышка. Завидую его жене (*****В.М.:** *Пашутка, не дай Бог, и не надейся – я не из ваших, а твои закосы на "Тузіне" под ником DeXta чересчур шаблонны, ты элементарно повторяешься*)***. Если она у него есть (*****В.М.:** *Да нет, что ты, я ведь даже стал миллионером, как раз самостоятельно родив себе дочь, о которой писал здесь*)***.***

**В.М. для Арв 01.11.07, 16′59:** Бельишко моё вы уж сами полощите, если так нравится, дорогая анонимная прачка, а про белорусов-националистов слышу не впервые. Это уж даже нудит как-то: стоит кому-то вспомнить родную мову, и он уже националист. Совсем недавно, когда ненавистный вам Андрей Плесанов ("P.L.A.N.") был приглашён выступить на фестивале "Blues жыве ў Менску" в одном весьма престижном зале (к/з "Минск"), к нему подошёл всем известный Геннадий Ст***АР***ико***В*** (Арв случайно выделилось) и от имени организаторов заявил: "Слышь, старик, только вот не надо на этом тарабарском языке петь, мы ведь музыканты, блюзмены, а не оппозиция какая-то". Так вот, Стариков лучше вас хотя бы тем, что говорил это не анонимно. А когда "P.L.A.N." всё-таки не послушал былого товарища и взорвал зал именно белорусскими песнями "Вялікае калі ласка", "Два шляхі", "Самотны блюз", "Сьветлая галава", "Шынкарачка", "Ранішнія адчуваньні", тот же Стариков спокойно признал успех белорусских песен, говоря: "Да, Андрюха, только мы с тобой можем расшевелить публику до глубины души". Думаю, что Арв роднит со Стариковым только одно – им обоим стоило бы кроме газеты "Правда" почитать ещё хоть какую-нибудь европейскую философию. Например, немца Вильма Швебеля: "Если на родном языке можно говорить только шёпотом, значит страну захватили враги". Мы с Плесановым осмелива-

емся говорить вслух, и только поэтому всякие Арвы и Стариковы называют нас националистами и оппозиционерами. Но не волнуйтесь, нас это только подзадоривает и убеждает, что избрали правильный путь. Мы, а не вы. Да вы вапшчэ враги собственной страны, isn't it?

# Вынікі

**Сяржук для всех 31.10.07, 10'27:** ***А як добра ўсё пачыналася...***

**В.М. для всех 01.11.07, 17'38:** Не грустите о дураках, Сяржук, ибо без них было бы вообще скучно. Правда, я вижу, тут уже многие утомились моим интервью. Да и я, в принципе, тоже, поскольку как на работу целую неделю проходил в "Музыкальную газету" безо всякой зарплаты. Правда, хотелось догнать Олега Климова по количеству поступивших постов. Вот за неделю и догнал. Спасибо. Отдельное спасибо Олегу за предложенный ресурс. На этом решил заканчивать. Все свободны. P.S. А в заключение всё-таки повторю текст о Шуме, скачанный с "Гостевой" сайта "Тузин гатоу" (Военком, 01.11.2007, 08'47, пост №8070), а то как-то несерьёзно: мы о нём говорим, а его всё удаляют здесь. Страна должна знать своих героев:

**ВОЕНКОМ:**

Прочитал в гостевой "Тузіна гітоў" следующее: (Шум: «Все теперь гадят на форуме "Музыкальной газеты", травят там В. Мартыненко...»). Я тоже решил зайти туда, дабы ознакомиться. Что же получается: на "Тузіне", превратившемся в болото, гнусные фразы Шума почему-то не удаляются (Шум: «Так что закрой свой рот и займись онанизмом вместо того, чтобы срать в гостевой; Вы, господа доброжелатели, мне уже остоебенили; Подошёл бы хоть один пидор из вас – крикунов, да разобрался по-мужски, чем загаживать тут гостевые...»). И это же он не о себе, что было бы по делу, а о вполне вменяемых людях. Но он вписывается в цели и задачи "Тузіна": притчей во языцех стало здесь тотальное забанивание именно уважаемых людей. Это похоже на какую-то преднамеренную тактику сайта против конкретных лиц. Каких? Я был удивлён, прочитав и на "МГ" от Шума про уважаемого журналиста В. Мартыненко ещё более гнусное (Шум: "Этот престарелый

парень срывается на визг, как фригидная баба. Я, ей богу, не кровожаден, но хочется двинуть по лбу", "Слышь, Витя, не трогайте меня, а? Не надо Святого трогать. А то ведь заебу без мыла, и не пальцем – черенком от лопаты"). И тут я понял, что с такими Шумами надо бороться другими методами. Первое, вскрыть то, что так прячет сей аноним: ДОРОШЕНКО (я тебе по-ШУМ-лю, чмо ты подпольное!), у нас в армии такие обиды смываются кровью, поэтому обещаю тебе, что на первом же концерте, который ты будешь проводить, тебя заберут и в наручниках доставят туда, где ты должен был находиться еще девять лет назад. Но только уже в дисциплинарный батальон. А там уж, поверь, ты испытаешь всё, что так живописно сыплешь для других (и без мыла, и без вазелина). Слово офицера!

**В.М. для всех 01.11.07, 17′52:** Усё, я сыходжу! Фірштэйн, сябручкі й дабрачкі, каторым трэба благіх цытатаў зь мяне? Жуйте, может у кого переварится, но вряд ли будет питательно с таким подходом.

**Rider для всех 01.11.07, 17′52:** ***Ну что же… Похоже, "интервью" подошло к концу. Предлагаю всех участников и свидетелей сего "интервью" высказать своё мнение об господине Мартыненка, а оно, думаю, есть у всякого. Своё пока попридержу (*****В.М.:** *Хоць зноў кульгае лёґіка, калі ён "прэдлагае фсех высказаць", мо ўсё ж варта было падзякаваць і Ridera за сумленнасць, бо невыпадкова ж ён слова "интервью" ў двукосьсе ўзяў – ведае сабака, чыё мяса есць. Гэта наіўны Ігонін піша пасьля ўсяго гэтага пра нейкую пераважную павагу да інтэрвіююемага, выказаную ў пытаньнях, а Шум і Rider сумарна даюць найбольш адэкватнае азначэньне – "интервью"-травля. Але залішне дзякаваць нестрыманаму сабаку, які нават уласнае слова – "Своё мнение я пока попридержу" – ня здолеў стрымаць і папёр слоўны панос, так і не дачакаўшыся выказваньняў ад іншых****)**.

**Rider для всех 01.11.07, 19′53:** ***Ладно. Я скажу вот что. На протяжении всего этого "интервью" меня не покидала мысль, что всё это уже было и не раз (*****В.М.:** *Цытата з клясычнай літаратуры, у якой хаваецца адно – жаданьне апраўдаць будучы нарыхтаваны шаблён, які яму нехта прадыктаваў, але які абавязкова трэба сюды прышыць, хоць і белымі ніткамі да каляровага****), что-то весьма знакомое, манера поведения, ответы… Ага. Точно. Есть ещё один господин. То же аристократ (*****В.М.:** *А может ТОЖЕ – в смысле слитно слово-то пишется в данном случае?****). То же князь. То же***

***липовый, правда... Который на пресс-конференции, на непонравившийся ему вопрос от журналистки, начал огрызаться и вопить: "К вам тут звезда приехала!", "Мне не нравится ваша розовая кофточка!" (*****В.М.:** *Rider, а на вас такса-ма была ружовая кофтачка? Дзіўны выбар для мужчыны, хай сабе й ананімнага, але я раўнадушны да гэтага. Адно параю: завязвайце з ананімам),* ***"По-русски научись говорить!" И т.д. и т.п. И с матом. Филипп Бедросович Киркоров. Но он всё же фигура поизвестней. Моё мнение о Викторе-Витауте Мартыненко не изменилось (*****В.М.:** *А маё пра вас і не состоялось, бо вы ж так і не разгарнуліся ў празе сталага публічнага ананіраваньня).* ***Единственное, за что стоит отдать ему должное (*****В.М.:** *Аддай, я фсё прашчу!),* ***так это за то, что он так долго смог простоять "у руля" музжурналистики. (В отличие от, скажем, Адама Глобуса, который тоже раньше много писал "пра рок", а потом переключился на литературу). В своё время, в конце 1980-х, допущенный до страниц советской областной, а затем и республиканской прессы, умудрялся проталкивать одному ему симпатичных маргиналов от музыки. Но это из разряда анекдота про неуловимого Джо. Никто не ловит (*****В.М.:** *Найцікавейшае, што нават сам Rider усё ж ловіць, і даўно, бо гэтак натужна чытаў дзеля нейкае мэты ЎСЁ напісанае мною, і чытаў больш за Ґлёбуса, якому змайстраваў тут ліпавую біяґрафію. Зрэшты, і мне ён памылкова прыпісаў абласную журналістыку і міфічны канец 80-х, бо пачынаў я ў канцы 70-х акурат у рэспубліканскай, а, пасьля выдатнай абароны дыплёма ў БДУ, скончыў у ЗША).* ***В музыке, особенно современной, он не петрит, похоже, ничего. Только и остаётся, что травить байки про "Бони М", "Гранд Фанк" и то, что он придумал новые музыкальные термины, типа "музыка третьего направления" или "стод-рок" (*****В.М.:** *Во які начытаны,.. ці напіханы,.. бо гэта адзіная згадка тэрміну "стод-рок" у дадзенай кнізе, чаму й не пасуе да гэтых псэўда-высноваў),* ***которые сам и использовал. Главное для него национальная идея (*****В.М.:** *А Ride-ru толькі й застаецца, што прафэсыйна ўсё гэта падчытваць за непетряшчым у музыцы Мартыненкам і аббрэхваць, бо лепшага нічога не знайшоў ў беларускай музкрытыцы).*

**editor для всех 02.11.07, 09'55:** ***Оно мне надо? (*****В.М.:** *А вось тут і варта разгарнуць таямнічыя карты, бо ў хоры сварлівых сабак усё ж выявіўся чалавек, якому сорамна брахаць. Хто ён? І ня многіх зьдзівіць, што пад мянушкай Editor тут увесь час выступаў*

*менавіта рэдактар. Рэдактар часопіса "Jazz-Квадрат" Алесь Астраўцоў).*

**В.М. для editora 03.11.07, 05'10:** Менавіта, бо судзьдзі хто? Іх проста няма, бо няма імёнаў, якімі ганарыцца чалавек. Таму й філязофскім рэнамэ сваім яны зрабілі бяззьвязны набор словаў! Проста, есть мнение, якое камусьці трэба сюды цішком прапіхваць. Не сюды, на форум, а сюды, у Беларусь. А што да параўнаньняў гэтага ананімнага сьмельчака-Ridera, дык з роду Кіркораў я ведаю толькі аднаго – вялікага этноґрафа Адама Кіркора, а чужынскія куміры ў галовах толькі чужынцаў. Так што я дык скажу наступнае: а мне яно сапраўды трэба, шаноўны editor, бо размаўляю я ня з гэтымі Блумамі, Хрунамі, Арвамі ды Шумамі, а зь вечна жывым у будучыні беларускім народам. Яму ўсё гэта будзе патрэбным нават праз 100 гадоў, бо кніга Вітаўта Мартыненкі "Rock on-line" ужо рэальнасць і факт гісторыі. Гэта размова пра нашыя адносіны да саміх сябе. Дзякуй усім за ўдзел у культураляґічным экспэрымэньце. І "Маналёґ старога інтэрнэт юзэра" з "Шчасьлівай сямёркі" В. Шалкевіча (2010) не забывайце. Там пра такіх Райдэраў: *Ты мог бы быць багатым прадпрымальнікам,/ Ці весьці шоў зранку па БТ,/ Ці на заводзе трактарным начальнікам,/ Ці скончыць ў Пінску унівэрсітэт,/ Але ты сядзіш на хутары,/ Грэбаеш ў кампутары./ За вокнамі зьмяняецца надвор'е,/ І сойка нешта гадкае крычыць,/ А Rider ўрослы перад маніторам,/ Сядзіць няўцямны, кім яшчэ мог быць.*

Гэта заканамернасць: да ананімнай актыўнасьці схільныя тыя, у каго жыцьцё ня склалася. Так што і вы, editor, не ператварайцеся ў Ridera, ад якога чуваць толькі брэх, але нават імя ніхто ня ведае (акрамя нас з вамі).

# Post factum: сарказм крепчал

**Кася Сарокіна для Вітаўта Мартыненкі 02.11.07, 16'46:** Паважаны Вітаўт! Сёньня я села і разам прачытала інтэрвію зь Вітаўтам Мартыненкам на форуме "МГ". Дайшла да словаў Вітаўта, скіраваных да Шума: "Но я благодарю и вас. Хотя бы за подаренное разочарование одной якобы очень интеллигентной особой –

Касей Сорокиной (уж не от вашего ли журнала "Сорока" тут корни?). На том же "Тузине" она с интересом посмотрела бы, как вы черенок будете куда-то вставлять".

Вітаўт, ад Вас я гэтага не чакала. Калі б Вы ўважліва прачыталі тое, што я напісала ў адказ на пагрозы Шума пра "черенок от лопаты", то б зразумелі, што я ў гэтым выпадку менавіта на ВАШЫМ баку: "А мне вось цікава было б паглядзець (**В.М.:** *Трэба было адразу й дадаць – з боку Мартыненкі, адтуль цікавей*), як Шум спадару Вітаўту "без мыла, и не пальцем – черенком от лопаты". Слабо яму будзе. Адна справа, сядзець у сваім Магілёве і, як кажа ягоная паплечніца, "др*чіть" клявіятуру падобнымі выказваньнямі, а зусім іншае – набрацца (мужнасьці?), прыехаць да нас і хаця б на 20% спраўдзіць свае пагрозы. На маю думку, Шума даўно пара забаніць за такія выказваньні".

Няўжо Вы, разумны чалавек, ня здолелі ўбачыць у маім пасьце сарказму менавіта ў дачыненьні да Шума?! Тым больш пазьней на рэакцыю DeNoizer я напісала: "Калі б Вы ўважліва прачыталі мой пост, то б ня сталі наракаць (тым больш так агулам!) на ўсіх жанчынаў. Сутнасць выказваньня ў наступным (во дажылася – тлумачыць пачала): я лічу, што Віталю (Шуму), як апынулася – Дорошенко, слабо нават даехаць да Менску (**В.М.:** *А сам ён піша, што нават да Масквы даязджаў, калі трэба зьбегчы*), ня кажучы ўжо пра працэс пакараньня сп. Мартыненкі такім пікантным чынам. Карацей, як кажуць дзеці, "мала какі ў ср*ке":)... Так што далей за маніпуляцыі з клявіятурай у Шума справа ня дойдзе, не хвалюйцеся (**В.М.:** *Ура! Кася перакананая, што дрАжніць кволага сабачку. Вось толькі беларускую мову спадарыні Штырліц варта было б падвучыць: не "какі ў ср*ке", а "какі ў ср*цы"*)".

І ў тым жа пасьце: "А Вітаўта я паважаю, нават нягледзячы на тое, што нашы меркаваньні наконт музыкі і асобных гуртоў разыходзяцца шмат у якіх накірунках)". Таму, перад тым, як называць мяне "якобы интеллигентной особой" и "молодым уродом" (цытую: "Такое впечатление, что всех, кого допускают к работе на "Тузіне гітоў", сперва заставляют пройти курс молодого урода: например, привести мамку и плюнуть ей в лицо или что-либо подобное"), калі ласка, хаця б пазнаёмцеся са мной бліжэй (**В.М.:** *Кася, чаму вы так адназначна слова ВСЕХ прыпісалі толькі сабе? Мо потым менавіта таму, пры знаёмстве бліжэй, вы нешта недвусэнсоўна намякалі пра свайго мужа*).

**2 Вітаўт Мартыненка:** Я нікому не дазволю сябе зьняважаць (**В.М.:** *Ну да, дзевушка ж чэсная: я замужам, але пазнаёмцеся са*

*мной бліжэй...*). Тым больш вось так – у размовах з іншымі людзьмі, у маёй адсутнасьці. Я не лічу, што чымсьці Вас абразіла (**В.М.:** *Як і я Вас*), наадварот, я ставілася і, нягледзячы на гэтае непаразуменьне і Вашу зьнявагу, працягваю паважаць Вас за тое, што Вы зрабілі ў беларускай музычнай журналістыцы і для беларускай музыкі. Таму зараз я патрабую, каб Вы публічна ПРЫНЕСЬЛІ МНЕ СВАЕ ПРАБАЧЭНЬНІ. Вы зьняважылі мяне ня толькі як журналіста, але і як жанчыну.

**В.М. *(пасьля падзеяў):*** Вось як атрымліваецца, Кася: калі на вашым фінансаваным з Масквы беларускім сайце "усе пайшлі Мартыненку травіць", вашыя словы («А мне вось цікава было б паглядзець, як Шум спадару Вітаўту "без мыла, и не пальцем – черенком от лопаты"...») трэба ўспрымаць як саркастычны ўзор нейкай надзвычайнай павагі? Я не разгледзеў за гэтымі словамі ні журналіста, ні тым больш жанчыну, але ваш камэнтар з "Музыкальной газеты" мне даслалі пасьля таго, як я пакінуў тое поле цкаваньня (траўлі), таму апошнюю ягоную фразу магу цяпер толькі пераадрасаваць Вам: **Вы зьняважылі сябе ня толькі як журналіста, але і як жанчыну**.

Чаму ў мяне такія вычварныя думкі? Гэта ня нейкая асабістая крыўда (я ж ня крыўджуся на ўсіх тых недабеларусаў, якія дружна ідуць травіць Мартыненку толькі за тое, што ён валодае роднай мовай бяз слоўніка, бо яна зьяўляецца для яго адзінай істотнай прыкметай роднасьці ў зьявах культуры; ды так ва ўсім сьвеце). Проста, не для жаночых вуснаў словы кшталту "др*чіть" нават у цытатах ад іншай жанчыны, а журналіст да таго ж павінен яшчэ часам задумвацца, чым слова наша адгукнецца). Дый увогуле, на будучыню: калі бачыце, што дзікі натоўп рэальна травіць хай сабе й вашага ворага, ня трэба разам з хорам сяброў чытаць яму лекцыю аб шляхетных паводзінах – усё адно не пачуе, бо вушы нагамі забіты... (хаця б на вашыя жаданыя або саркастычна дапушчаныя 20%). А вы ж кінуліся дражніць сабак.

Найбольш дзіўнае, што простыя словы "На маю думку, Шума даўно час забаніць за такія выказваньні" прагучалі ад вас толькі ў ціхім нашым міжсабойчыку. А вось дзе была Ваша павага, калі вашыя аднадумцы Мартыненку забанівалі на "Тузіне" за нейкую нібыта некарэктнасць (прычым так інтэліґентна: "Куды ты шчэмісься!")? Вы прынцыпова па-журналісцку... прамаўчалі. Ну як сапраўдная жэншчына! Таму на разьвітаньне анэкдот: "Эпітафія на магілцы: Сьпі спакойна, сябра, факты не пацьвердзіліся". Гэта можна прыгадаць на выпадак, калі "далей за маніпуляцыі з

клявіятурай справа ў Шума ці ягоных паплечнікаў усё ж дойдзе". Вы ж нездарма дражнілі сабаку.

Дый пра "молодых уродаў", паўтаруся, ня варта гэтак катэґарычна браць усё на сябе, проста пачытайце сваіх сяброў, зь якімі працуеце, і ўсё зразумееце. "Тузін гатоў" (мімавольная памылка на тым форуме, бадай, сталася прарочай).

"Вы ня здолелі ўбачыць у маім пасьце сарказму"? Так, сарказм крепчал разам з маразмам, я заўважыў!

**Eduard 03.11.07, 10′50:** ***У гэтым інтэрв'ю шмат букаффф. Ніасіліл. Паспрабую знайсьці час і пафтыкаць у гэта ў панядзелак на працы.***

# Дадатак

## Два дні "Свабоды"

www.svaboda.org 01/02.VIII.2006.

**Вітаўт Мартыненка:** *«Я ўпэўнены: народ, які ня мае сваёй маскультуры на нацыянальнай мове – ня будзе мець культуры ніякай. Тым сябрам, якія спрачаюцца з гэтай высновай, лічачы, што важней сур'ёзная культура, я адказваю: "Вы слухаеце Чайкоўскага, а ня ведаеце Манюшку, Равенскага, Забэйду-Суміцкага, таму што звыклі слухаць штодзень па радыё чужы прадукт!..»*



Вітаўт Мартыненка дома з сваім катом Адольфам (2008)

**Вітаўт Мартыненка** – музычны крытык, журналіст, паэта. Нарадзіўся ў 1959 годзе ў Менску. Па матчынай лініі паходзіць з шляхецкага роду Галімскіх. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ, працаваў у моладзевым друку 80-х, вёў музычны "гіт-парад" на радыё "Свабода" 90-х, аўтар шматлікіх публікацыяў ня толькі пра музыку, але й падарожных нататак з вандровак па Італіі, Канадзе, Польшчы, Швэдыі, Нямеччыне ды інш.

У 1989 годзе ў ЗША выйшла кніга журналістаў Вітаўта Мартыненкі й Анатоля Мяльґуя "Праз рок-прызму", дзе былі сабраныя артыкулы на тэму нацыянальнай рок-музыкі ў розных краінах. У 2002 г. В. Мартыненка адрэдагаваў і падрыхтаваў да друку кірыліцай зроблены ксяндзом Пётрам Татарыновічам (заснавальнікам беларускай службы радыё "Ватыкан") пераклад на беларускую мову раману Генрыка Сянкевіча "Quo Vadis?"; асобным выданьнем выйшла ягоная прадмова да кнігі ("Свой сярод чужых", Менск-Берасьце, 2003, выдавецтва ґазэты "Царква"). Многія гурты выконваюць песьні на ягоныя вершы – "P.L.A.N.", "Тэзаўрус", "Deadmarsh" ды інш. Апошняй вялікай

працай стаў зборнік музычных рэцэнзыяў "222 альбомы беларускага року і ня толькі" Вітаўта Мартыненкі ды Анатоля Мяльгуя. Вітаўт мае дачку Альдону 15 гадоў (на час інтэрвію), якая пазьней, у 2009-м, стане студэнткай Беларускага эканамічнага ўнівэрсытэту.

[31/07/2006, 23:46] **Спадар Вітаўт, а Вы самі сьпяваеце?**

Дзякую за пытаньне, якое, як кажуць, "у точку". Так, я сьпяваў, і нават дзесьці ў 1986 годзе мы зь цікавым ґітарыстам Севам Крамушчанкам (цяпер гэта грамадзянін ЗША Стыў Крамэр) стварылі свой рок-гурт "Юрась Братчык". Мне падабалася ягоная музыка (потым ён рэалізуе яе ў рок-гурце "Бава", які ўпершыню праявіцца студыйна на трыбʼют-альбоме Сяргея Новіка-Пяюна "Дні лятуць"), а сам меўся ў тым праекце толькі пісаць тэксты, але ён пераконваў мяне, што я цудоўна спраўлюся й з вакалам, хоць сам я сумняваўся. Цікавай была ягоная ідэя закасіць пад "Cirith Angol", але насамрэч я ня змог бы закасіць і пад Віктара Вуячыча ды цьвяроза ўсьведамляў гэта. З ідэі так нічога й ня выйшла, бо Бог надзяліў мяне іншымі здольнасьцямі, у прыватнасьці – здольнасьцю вэрбальнага асэнсаваньня музыкі, – якія да таго ж істотна разьвіліся пад уплывам майго лепшага сябры й ідэйнага натхняльніка Анатоля Мяльґуя. Каб не Анатоль, я, магчыма, да сёньня безвынікова шукаў бы беларускага зерня для душы ў нацыянальна мёртвых праектах кшталту "Drum Ecstasy", "Лепрыконсы" ці Руслан Алехно з Наташай Падольскай. Зрэшты, наконт сьпеваў магу, аднак, дадаць, што мой вакал усё ж такі можна пачуць у песьні "Diss ад Please", якая выстаўлялася для спампоўваньня на сайце "Наша Беларусь", калі была там цікавая музычная рубрыка, потым украінскі "AntiShowBiz", а найлепей дыск "Беларускі ґлёбус" не забывайма (трэк 16).

[01/08/2006, 00:05] **Вітаўт, а чаму вы майку запраўляеце ў майткі (шорты?)? Мне падаецца, гэта безґустоўна. Як можна давяраць музычнаму ґусту чалавека, які выглядае як бомж? Дзякуй, Аўрэліяна.**

Дзякую за ўвагу да зьмесьціва маіх шортаў, але калі кагосьці цікавіць, што я запіхваю ў штаны, дык адразу магу засьведчыць, што гэта не датычыць музыкі. Але што да закранутага лёсу майкі, дык магу сказаць: мела яна задавальненьне быць і навыпуск (гл. здымак А. Лянкевіча на вокладцы кнігі), і ўнутр (гл. здымак П. Сучынскага на стар. 191), і г.д. Бадай, галоўнае тут: як спадабаецца ў дадзены момант ейнаму гаспадару, як яму зручна, таму што на подыюм, на нейкі парад стэрэатыпаў, я

выходзіць не зьбіраюся. Калі вас цікавяць інтэлектуальныя размовы з пацанамі на подыюме, дык я вам не зайздрошчу. Адно раю не забываць народную мудрасць, што паводле вопраткі толькі сустракаюць, а ўсё астатняе вызначае РОЗУМ, якому вы, аднак, не давяраеце. Дакладней, вам ніколі не дакапацца да РОЗУМУ, бо вас палохае зьнешні выгляд. Але гэта толькі папулярны шаблён нашага беларускага совка: памятаю, пад'ехаў я на сваім "Фольксваґене" за жонкай на ейную працу, дык нават да вокнаў папрыліпалі зайздросьнікі: "О, які ў цябе муж!" А тут муж выходзіць у паўкедах з машыны пакурыць і... для дэбілаў аўтарытэт адразу згас. Цяпер я разумею, чаму Язэпа Драздовіча, Джозэфа Конрада, Вінцэнта ван Ґоґа ды іншых ня вабіў стыль подыюму: шукаючы аднадумцаў, яны адразу скідвалі драбноту летуценнай увагі недалёкіх фэтышыстаў.

[01/08/2006, 10:36] **Прывітаньне, Вітаўт! Пытаньне можа рытарычнае, але калі, на Вашую думку, зьявяцца ў Беларусі незалежныя беларускамоўныя радыёстанцыі (як, напрыклад, было "Радыё 101,2")? Якую музыку, колькі працэнтаў павінны яны круціць? І яшчэ пытаньне: калі зьявіцца сайт у радыё "Рацыя"? Дзякуй. Сяргей, Вілейка.**

А хіба іх няма? Гэта раней, як цьвердзіць клясыка, нас толькі хлусьнёй кармілі нават у часіны нацыянальных катарсісаў кшталту вайны, чарнобыльскай катастрофы ("Нешта яны зь Менску, чэрці, нічога не гавораць... Вайны спалохаліся, крамы пазачынялі, але хто каго... нічога ані гу-гу, а так усё баявыя песьні граюць. З захаду во ізьвесьція прыйшлі: Беласток, Гродна, Ліда занятыя. Усё начальства на скрут галоваў удрала: і НКВД, і міліцыя... Пасьля першай бамбёжкі як падурэлі")[44], а цяпер... Я асабіста слухаю беларускія перадачы радыё "Свабода", "Polonia", "Рацыя", "Ватыкан" "Эўрапейскага радыё". Калі вы маеце на ўвазе рэаліі ўнутры нашай краіны, а не замежжа, дык тут пытаньне трэба ставіць яшчэ шырэй: а калі зьявяцца ў Беларусі незалежныя выдавецкія структуры (і кнігі, і дыскі), гандлёвыя арґанізацыі, бо тое, што мы вырабляем мізэрнымі тыражамі ды потым абменьваемся ў вузкім коле, ня можа разглядацца ў структуры пэўных уцямных эканамічных разьлікаў. А падаткі ж грабуць з гэтага куды больш за эканамічныя: калі я здаваў у дзяржаўную

[44] *Цытуецца паводле выданьня:* Кастусь Акула "Гараватка": кніга 3-я "Беларусы, вас чакае зямля", (Toronto, выдавецтва "Пагоня"/"Greenwood Ltd.", 1981, стар. 10).

краму свой беларускі "Quo Vadis", дык ягоны кошт абрастаў там удвая і прадаваўся па 1 экзэмпляры ў месяц. Натуральна, увесь астатні наклад разыходзіўся хутчэй праз архаічны прыватны натуральны абмен.

Так, я таксама мару пра зьяўленьне ў Беларусі радыё, якое мог бы слухаць нармальны беларус, дзе б гучала лепшая польская, украінская, фінская, швэдзкая музыка і ўсе беларускія навінкі, а ня той інтэрнацыянальны шляк, які ґвалтам ідзе да нас з Масквы. Я б мог шмат распавесьці, як пільнуюць нацыянальныя інтарэсы ў гэтым пытаньні італьянцы, швэды, немцы, канадыйцы, палякі, бо сям-там давялося пабываць, але што казаць пра "нацыянальныя" інтарэсы рыбы, у якой татальна адгніла галава, і яна адно марыць, ці хоць зьесць яе хто-небудзь. Але ж гэта вынік НАШЫХ паводзінаў: так мы галасуем на выбарах, так мы абараняем свой выбарчы голас.

Я асабіста не чакаю, калі што зьявіцца ў Беларусі, а выкарыстоўваю рэальна наяўныя магчымасьці. Нават у нашай з Анатолем Мяльґуем новай кнізе ёсць артыкулы, якія друкаваліся і ў "Советской Белоруссии", і ў "Нашай Ніве". Прызнаюся, і там і тут зазнаў ґвалт з тэксту, таму шчыра рады, што кніга (толькі кніга) ўтрымлівае поўныя варыянты.

[01/08/2006, 11:49] **Вітаўт, а дзе можна набыць вашую кнігу "222 альбомы беларускага року"? Лявон.**

У рэклямным флаеры (ці ўлётцы) пазначаны такія кантакты: м.тэл. 649 08 88, 766 24 25, цераз пошту – 220085, Менск, а/с 5; або E-mail: w1979@tut.by, або сайт: http://www.belmusic.org ці проста шукайце традыцыйныя месцы кучкаваньня беларусаў (канцэрты, нацыянальныя суполкі, офісы палітычных партыяў). Гэта спатрэбіцца тым, хто палічыць кошты крамаў "Акадэмкніга" (22000 рублёў) ці "Падземка" (29000) дарагаватымі для сябе. Ёсць яшчэ ў іншых месцах. Ну й са мной кантактуйце: vmartynenka@gmail.com.

[01/08/2006, 14:20] **Сапраўдны адраджэнец Вітаўт Мартыненка настолькі доўга "ў тэме", настолькі доўга "знутры" ведае нашую беларускую рок-музыку, што яму даўно пара падумаць пра кнігу ўласных успамінаў, чаго яму ад душы хочацца пажадаць. Зьміцер Сідаровіч.**

Дзякую, Зьміцер. Прыемна пачуць тут аднаго з гэрояў новай кнігі, стваральніка гурта "Камэлот". Сапраўды, ёсць што ўспомніць, што мы й робім часам, зьбіраючыся з Анатолем Мяльґуем на піва: то ён зьдзіўляецца, калі ў маіх успамінах знаходзіць нейкія падрабязнасьці, то сам мяне дзівіць яркімі

фактамі й дэталямі. Колькі кніг мы носім у сваіх галовах! Але дзе выдаўцы? Нават былы сябра Адам Ґлёбус выдае толькі сябе, сваіх братоў і стрыечнікаў (ну і для маскалёў нешта). Я рады, што калі не ў літаратурна-выдавецкім коле, дык хоць у музычным здолеў рэалізавацца мой вэрбальны запас.

Ведалі б вы, як адчуваў сябе няёмка ад'яўлены рок-хуліґан у студыі "Radio Vaticana" ў Рыме, калі яго запрасілі туды пасьля выхаду ґрунтоўнага тома беларускага "Quo Vadis"! А за гэта я асабіста дзякую акурат не выдавецтву "Мастацкая літаратура", ня Ґлёбусу, а музычнаму прад'юсару Віталю Супрановічу і гістарычнаму таварыству "Дыярыюш". Цяпер спадзяюся, што й для томіка маёй прозы й паэзіі яны знойдуць выдаўца, бо кніга прайшла ўжо дзяржкантроль салідных выдавецтваў, але так і ня выйшла.

[01/08/2006, 15:22] **Спадар Мартыненка, хто ці што зь беларускай музычнай маскультуры канкурэнтназдольны хаця б у кантэксьце нашых суседзяў -- іншымі словамі, хто там можа прадаць свой тавар? Ігар.**

Прабачце, але я чую пакутлівыя сумненьні сына ў вартасьцях роднай мамы. Ці да твару гэта нашчадку вялікай гісторыі, у якой кожны адукаваны чалавек сусьвету памятае, што нават у асновы славутай Канстытуцыі ЗША леглі напрацоўкі нашага "Статута" Льва Сапегі. Дык што ж вас цяпер прымушае юродстваваць: "хаця б у кантэксьце нашых суседзяў". На нас арыентуюцца ня толькі суседзі, але й сусьвет, але...

Посьпех любой зьявы музычнай маскультуры залежыць ад укладзеных сродкаў (гэта ў другую чаргу). А першая чарга ў нас так і зьзяе бляскам дыямэнтаў. Як вы мяркуеце, чаму славуты бразыльскі "Soulfly" (Макс Кавальера) для сваіх канцэртаў у Польшчы абраў сабе на разагрэў не нямецкі "Rammstein", у які ўбуханы мільёны баксаў, а наш бярозаўскі ":Б:Н:", у які ўкладзена... ня больш за тысячку? Я мяркую таму, што грошы не заменяць талент. А вось грошы пакуль мінаюць беларускі шоў-бізнэс. Камусьці гэта на радасць, але асабіста мне гэта не замінае бачыць талент. Я зусім не прад'юсар і не мільянэр, але атрымаўшы неяк пэўную суму ад продажу сваёй машыны, кінуў іх у беларускі гурт "Partyzone" (дэбютнік "Трэба рабіць"), які цяпер з задавальненьнем слухаю разам з тысячамі іншых "адмарозкаў".

Я ведаў, што першы альбом быў толькі дэма-запісам, але мяне ён так узрушыў, што я сходу захацеў падзяліцца радасьцю гэтага адкрыцьця з іншымі, не зважаючы на адсутнасць грошай на перазапіс. Праект удаўся, той "Partyzone" цяпер мае другі альбом

"Сьмерці няма", запісаны ў прафэсыйнай студыі (як і ":Б:Н:", дарэчы, з дзьвюма кляснымі альбомамі, на першым зь якіх таксама стаіць лёґо майго лэйблу "Prymamsi Records")... А потым і праект рээдыцыі леґендарнага "Мясцовага часу" мне ўдаўся...

Дый што вы прыпадабняецеся да сіраты, звужаючы свае крытэры ("хаця б у кантэксьце нашых суседзяў"). Каб вы бачылі, як у 1989 годзе на разагрэве польскіх канцэртаў нашай славутай "Бонды" выступалі нікому не вядомыя "Воплі Відаплясава", вы б так не прыбядняліся. А цяпер цытата з нашай кнігі: "Што украінцы зрабілі з "Воплямі", а мы з "Бондай", гаворыць не пра недахоп музычнага таленту ў беларусаў, а пра недахоп цьвярозай веры ў сябе".

Дый мая паездка ў Швэдыю выклікала запрашэньні на канцэрты туды нашых "Tesaŭrus" і "P.L.A.N.", адно праблема выявілася: так і не знайшлі, хто б з нашых багатыроў ахвяраваў ім хоць бы на білет. Так што праблема не ў музыках, як бачыце.



Увага польскіх мас-мэдыя пасьля канцэрту гурта "Tesaŭrus" у Торуню (2004)

[01/08/2006, 15:43] **Спадар Вітаўт, нярэдка выканаўцы сустракаюцца з аўтарамі тэкстаў, каб патлумачыць ім, пра якія думкі або пачуцьці яны хацелі б сьпяваць у той ці іншай сваёй**

**кампазыцыі – тады аўтар тэксту спрабуе "апрануць" гэтыя пажаданьні ў вершаваную форму. А як у Вас? Здараецца такое ці вы проста дасылаеце выканаўцам гатовыя тэксты? І яшчэ адно пытаньне. Ці лічыце вы, што трэба "слухаць сваё" толькі таму, што гэта сваё, не зважаючы, напрыклад, на невысокую якасць музыкі? Дзякуй. Аляксей, Пінск.**

Пачну з апошняга: я ня з тых, хто будзе есьці гаўно толькі таму, што яно сваё. Але той, хто не знаходзіць у сваім нічога, акрамя гаўна, проста хворы чалав... Прабачце, хворая жывёліна. ЧАЛАВЕК у любым кутку плянэты духоўна сілкуецца ТОЛЬКІ СВАІМ, а чужое слухае толькі дзеля знаёмства або параўнаньня.

Цяпер пра вершы. Музыкі часта зьвяртаюцца па іх, але я не з усімі магу супрацоўнічаць. Нават з цяперашнім маім сябрам Андрэем Плясанавым не адразу атрымалася супрацоўніцтва, але ён сьпярша згадзіўся ўзяць мае старыя гатовыя вершы. Як ён зрабіў "Цені гісторыі"! Я проста растаяў (яна ў першым альбоме "P.L.A.N.", які мае назву "Blues у канцы тунэлю", тыраж даўно ўвесь прададзены): во, думаю, як тонка чалавек, у якога я ня верыў, адчувае кожнае слова. А пасьля тым жа шляхам ён адгадаў у "Дусі" маё юначае захапленьне Джымі Гэндрыксам. Я адмовіўся агучыць некалькі ягоных уласных цудоўных мэлёдыяў, затое даў шанец выйсьці ў людзі таленавітаму канкурэнту Ярашу Малішэўскаму, і сам рады гэтаму. А вось "Блюз ад самоты" я сам зрабіў пад ягоныя (Плясанава) думкі й пачуцьці. Здаецца, ён толькі папрасіў нешта пра блюз і самоту. Але ніколі не было ніякага дыктату між намі. Мо, проста ёсць узаемаразуменьне.

[01/08/2006, 15:51] **Добры дзень! Цяпер у Эўропе, пераважна ў Скандынавіі ды Нямеччыне, заўважаецца сапраўднае адраджэньне музыкі ў стылі power-metal. Як вы думаеце, чаму ў Беларусі няма ніводнага саліднага гурта, які б граў у гэтым стылі? І яшчэ адно: мо вы ведаеце што пра лёс Джаґера – вакаліста аднаго з найлепшых беларускіх гуртоў 90-х, які, на жаль, не існуе ўжо – "Rouble Zone"? Дзякуй, А.**

А няўжо вы ня чулі раньні "Deadmarsh"? Дык вось на іхні альбом "Ґрані" (2003) захопленыя водгукі прыходзяць з той жа Нямеччыны й нават з далёкай Японіі. А чаму нават вы ня чулі пра гэта, раю вярнуцца да маіх адказаў Ігару крыху вышэй. Што да Джаґера, дык для мяне ёсць адзін Джаґер – Мік з гурта "Rolling Stones", а не "Rouble Zone". А што да нашага таленавітага эпіґона, дык я недзе чуў, што ён тусуецца ў рок-колах, але не пераймаюся гэтым, бо я ніколі ня слухаў "Rouble Zone", таму што на інґліш мне

бліжэй "Led Zeppelin". А беларускага ў гэткіх НАШЫХ не было нічога, акрамя менскай прапіскі.

[01/08/2006, 15:57] **Спадар Вітаўт, калі нехта кажа, што рок-н-рол памёр, дык мяне гэта злуе, а вас?**

А мяне НЕ! Ну што хвалявацца, калі для кагосьці нешта памерла? Для мяне рок-н-рол не памёр. Больш за тое: я сам жыву рок-н-ролам. Мяне, напрыклад, хвалявала ў 1980-х, што няма беларускага кантэксту ў гэтым жыцьці, а цяпер нядаўна падлічыў: у маёй калекцыі 50% беларускіх дыскаў, 10% польскіх, 8% украінскіх, 35% заходніх (немцы, італьянцы, брытанцы, амэрыканцы й г.д.). Ёсць нават адзін расейскі дыск нямецкай вытворчасьці, але не прымушайце мяне рэклямаваць чужую канкрэтыку.

[01/08/2006, 16:40] **Вы былі на плошчы 19-га (маецца на ўвазе гарачы беларускі сакавік'2006 і тагачасная плошча Каліноўскага)?**

Безумоўна, а яшчэ быў 20-га, 21-га, 22-га і г.д. Адно шкада: хоць і сустрэў там шмат сяброў – так і ня змог ні ў чым пераканаць камэнданта намётаў, калі той задаваў мне пытаньне: "А хто вы такі?" Яшчэ шкада, што калі я на просьбу тых жа сяброў прынёс на плошчу свае песьні ў выкананьні гурта "P.L.A.N." – прычым новыя песьні, бо ім надакучыла аднастайнасць тамтэйшае культурнае праґрамы – дык ніводная з гэтых песень так і не прагучала. Крыўд вялікіх на гэта ў мяне няма, бо ясна, што яны павінны былі засьцерагацца правакацыяў – але трэба ўсё ж засьцерагацца й вымесьці золата са сьмецьцем. А ў нас гэта рабілася даволі часта. Мяне мянты цягалі за беларускую мову, калі той хлапец яшчэ толькі пялюшкі мачыў, а цяпер ён стаў нейкім ОТК маіх учынкаў.

Калі я ня стаў вам аўтарытэтам, дык назавіце мне сваіх аўтарытэтаў. Але мы ня знойдзем шлях да нашай Беларусі, калі ўсім папярэднікам будзем казаць: "А хто вы такі?" Трэба ведаць сваіх папярэднікаў! Але нічога, затое пасьля таго з гуртом "P.L.A.N." мы стварылі клясную песьню "У горадзе чужых назваў", якая пазьней упрыгожыла дыск "Песьні Свабоды'3: плошча Каліноўскага", выходзіла й на яшчэ больш тыражным CD "Вольныя песьні", а потым нават стала гімнам руху салідарнасьці "Разам" Вячаслава Сіўчыка. Гэтая песьня – наш адказ кожнаму, хто хоча ведаць, дзе мы былі ў моманты нацыянальнага катарсісу: хтосьці піў шампанскае пад коўдрай, чытаючы Умбэрта Эко, а мы адчувалі сябе народам, калі былі ўсе разам на пляцы Каліноўскага. Гэта рэмінісцэнцыі паводле тых неадназначных песень свабоды.

[01/08/2006, 16:41] **Як вам гурт "Сябры"?**

Памятаю іх ад самага пачатку: я быў хлапчуком маленькім і прыгадваю, як сьпярша многія ўсьведамлялі гурт "Сябры" за эпіґонаў славутых "Песьняроў": маўляў, ай, гэта горш за "Песьняроў" і г.д. Але потым яны ўсё ж знайшлі сваё аблічча. Некаторыя іхнія песьні да гэтага часу любіць мая жонка, але ня я. Дый што за беларуская песьня – "Земля моя, Сибирь"? Няхай бы ў Сыбір і ехалі ды сьпявалі там пра родную зямлю... І такіх саўдэпаўскіх песень у іх шмат, хаця талент, натуральна, быў. Так што цяпер, на маю думку, гэта – звычайны дзяржкультапарат, шуміхі зь якога вышэй за талент. Я дапускаю, што талент можа памяняць палітычную арыентацыю, але адносіны да Радзімы й Слова Ойчага – ніколі. А вось "Сябры" лёгка мяняюць і тое, і другое.

[01/08/2006, 16:45] **Які колер павінен быць у Беларускай рэвалюцыі: джынс ці белы?**

Мне часам здаецца, што гэтая гульня ў колеры акурат і размазала наш сацыяльны пратэст. Ніхто, здаецца, і не намагаўся перамагчы – намагаліся натужна ўпісацца ў нейкую модную плынь каляровых рэвалюцыяў. Аднак, калі гаварыць пра колеры, дык беларуса ня можа не засмучаць адсутнасць і нават зьнявага спрадвечных колераў нацыянальнага сьцягу. У мяне захаваўся нават юначы верш – гадоў у 18 яго напісаў – магу прывесьці адну страфу: "А я бела-чырвона-белы, Я застаўся ўсё той жа веры: Колер бела-чырвона-белы – Мой сьцяг, мая сутнасць, мая любоў..." Дый у нас жа ня тыя самыя ўмовы, што нават ва Ўкраіне: чаму ў іх рэвалюцыя апынулася памаранчовай, а ня жоўта-блакітнай? Ды проста калі рэвалюцыя й рэакцыя маюць адзін колер – нацыянальны, тады й рэзонна ўводзіць дадатковую ґаму, а нас, беларусаў, зьядноюць толькі родныя колеры. Тожэ мне, джынсовую рывалюцыю прыдумалі... А штроксавую слабо? Падлеткі-пераросткі.

[01/08/2006, 16:47] **Парайце, калі ласка, дзе лепей адпачыць гэтым летам?**

Што я магу сказаць? Позна піць баржом, калі лета сканчаецца... Для мяне, напрыклад, лепшым адпачынкам доўгі час было "БАСовішча". Але яно патроху памірае, запусьціўшы ў свае шэрагі палымяных змагароў з "нацыяналістамі", таму параіць не магу нічога.

[01/08/2006, 17:35] **Вітаўт! Што Вы думаеце пра гурт "Мясцовы час"? Чаму пра іх не чуваць? Ці ёсць у іх альбомы?**

Што тут думаць – слухаць трэба! Бо гэта такі неператузыйдзены унікум! Там усё незвычайна, і галоўнае – якасна. Вакал незвычайны, кампазыцыя. Калі казаць пра альбомы, дык пры жыцьці калектыву іх выйшла 4 і ўсе на касэтах. Але зусім нядаўна знайшліся рупліўцы, якія ўзьнялі да лічбавай якасьці два лепшых рэлізы – "Мой дом" (1989) ды "Ускраіна" (1990). Яны выйшлі на адным кампакце і някепска прадаюцца – натуральна, я ўжо іх маю. Дый што казаць, калі на гэтым выданьні таксама невыпадкова стаіць ляґатып майго лэйблу "Prymamsi records". Але я сам пільна чакаю, калі ўжо вернуць да сучаснага жыцьця маю ўлюбёную "Слоту" 1987 году – гэта проста супэр! Яна б цудоўна ўпісалася на CD з альбомам "Халі-Ґалі" (1999).

[01/08/2006, 18:02] **Вітаю! Як вы ставіцеся да align="center"розна рода Смоловых, "Atlantica", Дорофеевых і да таго падобных зорачак (я пра лукашэнкаўскую эстраду)? Якая будзе роля сапраўднай беларускай музыкі пасьля прыходу нацыянальнай дэмакратычнай беларускай улады ў Беларусі і што стане з так званай эстрадай ОНТ і БТ? Усяго лепшага і дзякуй!**

Што я скажу – я ж не кандыдат у прэзыдэнты, каб разьмяркоўваць, што зь кім будзе... Адно перакананы, што Беларусь, дзе няма месца беларусам – вымрэ. Магчымасьці дзьве: альбо глухая правінцыя расейскай імпэрыі, альбо ўсё ж незалежная Беларусь з паўнавартасным жыцьцём. Апошняе, натуральна, цяжэй, таму знойдуцца аґітатары, якія будуць пераконваць пайсьці лёгкім шляхам. Але найлягчэйшы ў жыцьцёвым выбары – шлях бамжа. Дый песьні вялікага Шалкевіча не забывайма: "Шырокі гасьцінец цяністы і роўны пад самыя могілкі нас падвядзе"[45]. Які шлях выбера краіна з гэтых двух? Найбольш прышпільнае, што ў кожным выпадку ўся гэтая афіцыяльшчына (дзярж-попс) непатрэбная. Але засьцеражыцеся галасаваць агульным сьпісам. Напрыклад, у Дарафеевай мне давялося чуць даволі прыстойны беларускі альбом. Хоць гэта ня мой стыль, але талент у артысткі ёсць.

[01/08/2006, 18:05] **Што Вы думаеце пра "БАСовішча"? Максім.**

---

[45] *Песьня цытуецца паводле CD-выданьня:* Віктар Шалкевіч "Добрай раніцы", (Мн., 2002, "БМAgroup", трэк 1 "Жлобская нацыя"). *Ёсць таксама на CD-альбоме:* Віктар Шалкевіч "Правінцыя", (Мн., 2009/1992, "БелТонМэдыя", трэк 12 у CD-дадатку да кнігі "Блюз Вясна" бібліятэчкі часопіса "Дзеяслоў").

Я захоўваю сваё ліставаньне з БАСам канца 80-х, калі на падставе майго эсэістычнага цыклю ў беластоцкай ґазэце "Ніва" – ён называўся "Молада, сучасна, па-беларуску" – яны задумалі наладзіць унікальны нацыянальны фэст. Гэта ўдалося толькі ў 90-м, калі я на нейкі час апынуўся ў Канадзе. Але на многіх "БАСовішчах" я быў асабіста, нават журыў, а мяне тут усё называлі нацыяналістам розныя Максы Івашыны й Зьмітры Падбярэзскія. Што я магу думаць пра "БАСовішча", калі Макс Івашын цяпер там вядоўца, а Падбярэзскі майструе адтуль рэпартажы для радыё "Свабода"? І які зьмест тых рэпартажаў: "Эх, шкада, што на фэст не дапускаюць іншамоўных – атож бы "БАСовішча" гэтак выйграла!.."



У журы "БАСовішча'2003": Слава Корань, Алесь Памідораў, Вітаўт Мартыненка і Лукаш Стэпанюк

Так што цяпер я ўжо нічога ня думаю пра гэты фэст, куды дапусьцілі іншамоўных, а мы зь сябрамі шукаем аднадумцаў у сьвеце, якія б зразумелі, што беларус павінен мець хоць нейкі свой куток у хаце, які можа ні з кім не дзяліць – акурат жа такім было першае "БАСовішча", якое й утварылася, зрэшты, як пратэст на здушэньне нацыянальнай ідэі менскага фэсту "Тры колеры", ініцыяванага Анатолем Мяльґуем і нашым рок-клюбам "Няміга". А хто быў у камандзе здушэньня? Падбярэзскі, Івашын... Яны нават пасьлядоўнікаў падгадавалі. Вось такая раскладка. Шукайце канкрэтыку ў архівах, але факт: польскія беларусы здаюць Радзіму, расчыняючы русскую форточку ў сваю краіну.

[01/08/2006, 18:37] **Ці ня лічыце вы, што сам факт "андэрґраўнднасьці", у варунках якой дзеюць нашыя "не забеларусскія" музыкі, спрыяе захаваньню ў незалежных творцаў тоеснай сапраўднасьці, чысьціні памкненьняў і духу некамэрцыйнага рок-н-ролу 1960-х гадоў (гэта ж датычыць і незапрадаўшыхся ўладзе літаратараў). З павагай, В.А.**

Па-першае, давайце адмовімся ад рэфлексыйнай тэрміналёґіі на афіцыйную рыторыку. Напрыклад, я беларус не таму, што нехта там антыбеларус, а проста так лёсам дадзена. І я шчасьлівы, што жыву ў эпоху канструктыўных пераўтварэньняў. Гэтак і ўвесь беларускі рок можа апынуцца ў гушчы рэальнага жыцьця. А калі

прасьцей, дык варта паўтарыць тое, што мы з Анатолем Мяльґуем сказалі нядаўна карэспандэнткам "Музыкальной газеты" Кацярыне Бязмацерных і Тамары Мазоль: як толькі для рока створаць ідэальныя ўмовы, ён здохне.

Відаць, і вы, Вадзім, мелі тое на ўвазе. Я вельмі любіў, напрыклад, польскі рок 80-х (асабліва з плыні MMG), а цяпер... Вось нядаўна мне прывезьлі альбом гурта "Lzy": вакал супэр, граюць выдатна, запісаны яшчэ лепей, а ўражаньні... ну сапраўды адны "лзы", г.зн. сьлёзы. Але гэта ня значыць, што мы павінны праектаваць праблемы дзеля посьпеху нацыянальнага року. Ёсць такая рэч – рэальнае жыцьцё, дзе пакуль ніхто яшчэ не нарадзіўся старым і мудрым (хоць юныя й бадзёрыя паміралі). Давайце проста жыць і радавацца таму, што нам ёсць што паслухаць. Вунь нават на новым (на той час) дыску "Песьні Свабоды'2" на нашай мове засьпявалі ўжо і украінцы. І не ўпершыню. Дый як сьпяваюць гэтыя унікумы – "De Shifer" і "Тінь Сонця"! А на 2CD "Варта Вежы Багоў" вы сустрэнеце нават расейцаў, што сьпяваюць па-беларуску песьні нашага анґламоўнага "Gods Tower".

Гэта ж рабілася не дзеля лёзунґу "За Беларусь" ці "Перад Беларусь", а проста таму, што ёсць такі прад'юсар Віталь Супрановіч, ёсць ягоная "БМAgroup", не да канца задушана яшчэ нацыянальная ідэя паміраючага "БАСовішча". Значыць, ёсць шанец. Асэнсоўвайце гэта, і ў будучыні вам будзе чым падзяліцца з нашчадкамі.

І што да "чысьціні рок-н-рола 60-х", дык сёньняшні дзень усяляе мне больш аптымізму, бо "Мрою" ніхто нават у Расеі не назаве "Мечтой", а "Бонду" – "Куском", бо іхняя творчасць не давала падставаў. З 60-х я крыху ў дзяцінстве зачапіў "Шпакі", "Дойліды", дык ад сьведкаў таго часу мне падсоўваюць то беспамяцтва, то нейкіх "Зодчих" (усё той жа Падбярэзскі любіць гэта падкруціць). Відаць, ім і самім было прыемна быць "Зодчими", раз ніхто не пратэстуе. А імя – гэта сутнасць, і мы толькі цяпер навучыліся трохі адстойваць адметнасць нашых імёнаў. Я сам, напрыклад, не на жарт крыўджуся, калі мяне шыльдуюць нейкімі чужынскімі Витовт, Витольд у расейскамоўных ґазэтах, і радуюся, калі застаецца Витаут. Гэта ключ да маёй сутнасьці, якую, зрэшты, камусьці дазволена НЕ РАЗУМЕЦЬ. Але ж мы не называем А. Пушкіна Алесем Гарматкіным, Б. Шоў – Бэнем Паказухіным. Мы паважаем адметнасць чужых, дык і нашую адметнасць мусім прымусіць паважаць.

[01/08/2006, 22:37] **Як бы вы вызначылі: у чым адметнасць і непаўторнасць менавіта беларускага року? Ці ёсць яна наогул?**

Яшчэ якія адметнасьці! Наш рок разьвіваецца без аніякіх фінансавых уліваньняў – такога больш няма нідзе! А калі бяз жартаў – мой сябра Валера Краснагір лістуецца зь леґендарным Джэлам Біяфрам, вакалістам славутага амэрыканскага гурта "Dead Kennedys", дык той пастаянна піша: вышлі яшчэ што-небудзь зь беларускага панку, толькі з фальклёрным адценьнем. Людзей гэта ўражвае! Я чуў нават адну канадзкую каманду "Double standard", дзе йдзе анґламоўны рок-н-рол у рытме нармальнай беларускай полечкі! Адкуль гэта? Яны аналізуюць тое, што мы ствараем: у нас – энэрґетыка ў музыцы! Яны шукаюць адметнасьці, а нам карціць ад яе адцурацца!

[01/08/2006, 22:38] **А якую музыку слухае ваша дачка?**

Мая дачка, якую я, дарэчы, назваў Альдона – каб ніводны чужынец ня змог перайначыць гэтае імя, – выхоўвалася на Данчыку, вачэй ад яго не адрывала, падпявала касэтам. Нават не на песьнях, а на ягонай асобе выхоўвалася, на ягоным вабным выглядзе. У нас вісеў плякат, і яна на яго заўсёды замілавана глядзела. А песьням падпявала лепш за тату. Я неяк спрабаваў падпець Данчыку, але ў мяне слых слабенькі, дык яна кажа: "Тата, ты ня так сьпяваеш, во як трэба". І так дакладна перадавала ноты! Але пайшла ў школу – дарэчы, гэта была беларуская ґімназыя – і там навучылася іншым адносінам. Найперш крыку замест сьпеваў.

А неяк падыходзіць да мяне й кажа: "Тата, а пастаў найбольш улюбёныя свае песьні". Я паставіў "Led Zeppelin" і "Uriah Heep". Яна кажа: "Тата, я, відаць, рок не люблю. Я папсу люблю". Здаецца, можна ўжо было расплакацца й памерці. Але праходзіць нейкі час, і яна прапаноўвае мне паслухаць дыск – Avril Lavigne. От, думаю, шчасьце якое! У мяне ажно ад сэрца адлягло, бо усё-ткі поп-панк – гэта не папса. Цяпер яшчэ нейкіх гішпанцаў слухае й падпявае ім па-гішпанску, хоць я па-анґельску ня ўсім падпяваць магу... Падсадзіла ўсю сваю школу на песьню "Тваё каханьне" зь першага ліцэйскага праекту.

Мяне не турбуе, што яна ня любіла пэўны час ":Б:Н:" або "Partyzone", у альбомы якіх ейны татка ўклаў нямала асабістых грошай, затое Стас, сын майго сябры й аднадумцы Анатоля Мяльґуя, якраз і слухае ":Б:Н:", "Partyzone", "Чырвоным па-белым" (о, на апошняе й Альдона было падсела) – нам з Толікам адкрывае новыя зоркі ў беларускім року. А з другога альбому й для Альдоны ":Б:Н:" стаў улюбёным гуртом побач з магілеўскім "Майzeram".

Так што ў нашым "каралеўстве" ўсё нармалёва. Таму, дарэчы, мы і прысьвяцілі сваю кнігу нашым дзецям – Стасу Мяльґую й Альдоне Мартыненцы.

[02/08/2006, 00:40] **Вітаўце, чаму Вы вырашылі падкарэктаваць Татарыновічаў пераклад "Quo Vadis"[46]: займаючыся транслітарацыяй, Вы замянілі ня толькі правапіс, але й паасобныя асаблівасьці перакладчыкавай мовы? Чаму не абышліся проста карэктнай транслітарацыяй? Кніжка ж усё адно засталася ў даволі вузкім чытацкім коле з сваім накладам – 300 асобнікаў... Юрась.**

Мог бы проста адказаць, што "вырашыў падкарэктаваць", бо ў Татарыновіча ў штаце не было карэктара, але...

Не разумею, у чым прэтэнзыя. Наклад маленькі? У Вас асабіста які асобнік: у цьвёрдым пераплёце або ў мяккім? А мяккі лакаваны ці матавы? Усё гэта было на рынку, і рэч у тым, што на кожным варыяньце пазначаны наклад 300 асобнікаў, але вы чамусьці нават не захацелі зсумаваць лічбы. Вам так удабней? Сачуфствую! Але ва ўсялякім выдавецкім праекце наклад вапшчэ зьяўляецца камэрцыйнай таямніцай. І гэта ніяк ня сьведчыць пра якасць працы.

Каб я асабіста паверыў, што нобелеўскі лаўрэат выдадзены накладам 300 штук, я б з дубу ляснуўся. Затое памятаю, як рэдактары выдавецтва "Мастацкая літаратура", якое хацела выдаваць гэты варыянт "Quo Vadis" у 1996 годзе ажно 20-тысячным накладам (глядзіце адпаведныя выдавецкія тэмпляны), прымушалі мяне, як і вы, сьвята захаваць усе аўтарскія (ці наборшчыцкія) памылкі ды абдрукоўкі.

Хто чытаў раман на любой мове, усе ведаюць, што вілла цэзара Нэрона звалася Анцыюм (Ancium). Гэткую ж назву яна мела і ў Татарыновіча. Але ў нейкім месцы выскоквае нейкі "Анвіюм" (Anvium). Дастаткова зірнуць на ўсялякую стандартную клявіятуру, каб зразумець, што гэта абдрукоўка: лятынскія літары C і V стаяць побач у ніжнім радку. Дык што, трэба яе захоўваць?

[46] Нобелеўскі раман Генрыка Сянкевіча "Quo Vadis" у беларускім перакладзе ксяндза П. Татарыновіча выйшаў кірыліцай у менскім выдавецтве "Мэдысонт" пад рэдакцыяй, з камэнтарамі й прадмовай В. Мартыненкі ў 2002 годзе пачатковым накладам 1000 асобнікаў і хутка стаў бібліяґрафічным рарытэтам. Транслітарацыя спатрэбілася дзеля таго, што першаснае выданьне таго тэксту выйшла лятынскім шрыфтам беларускай мовы (Рым, 1956, выдавецтва "Źnič"). Дадамо, што гэта найбольш поўны тэкст з усіх вядомых нам перакладных вэрсыяў.

Карацей кажучы, ня трэба клапаціцца, каб сьвята захаваць усе памылкі. Там былі ў тым ліку й перавернутыя абзацы, абрэзкі незавершаных абзацаў – я знайшоў іхнія канчаткі, выклаў тэкст паводле аўтара, а не перакладчыка (ці мо нават звычайнага наборшчыка), паставіў правільную нумарацыю частак паводле арыґіналу. Галоўнае, што праца Татарыновіча стала ня толькі ґрандыёзнай ды унікальнай – ягоны тэкст больш поўны за расейскія пераклады, захоўвае унікальную беларускую стылістыку, лексіку – але цяпер бездакорны й прывабны для чытача. Вы што, супраць гэтых вартасьцяў для беларускай кнігі?

Дзякаваць Богу, іншыя чытачы маюць больш слушную думку, раскупіўшы ўвесь наклад цалкам. А з прэсы вядома, што мой беларускі "Quo Vadis" суцяшаў нават палітзьняволеных у вязьніцах падчас гарачай беларускай вясны 2006. А іх таксама было не 300. Затое я маю яшчэ й падрыхтаваны да друку варыянт клясычнага правапісу кірыліцай – дасьціпна адрэдагаваны, дапраўлены й адкамэнтаваны. Толькі дзе вы, выдаўцы беларускія? А яшчэ ж існуе беларускі пераклад "Quo Vadis" Анатоля Клышкі, свой, адметны (я, праўда, чытаў толькі фраґмэнты, але асалоды параўнаньняў хапіла).

[02/08/2006, 09:54] **Вітаўт, чаму вы лічыце сябе адзіным і непаўторным у беларускай журналістыцы? Ці ёсць у вас дастойная зьмена? Як вы адносіцеся да ґазэты "Наша Ніва"?**

А яшчэ я бездакорны і ўсемагутны? Толькі пакажыце, зь якіх крыніцаў вы мяне цытуеце, дзе я сябе так называў? Ці самі выдумляеце? Дык дзякую за камплімэнт! А я, нават калі мяне правакуюць, не займаюся самаацэнкай. А вось непублічным самааналізам заўсёды.

І наконт ґазэт – пагартайце любую прэсу, і вы зразумееце, якія ў мяне зь кім адносіны. Ці проста пагартайце нашу зь Мяльґуем кнігу "222 альбомы беларускага року" – там усе ґазэты нароўні пазначаны ў канцах рэцэнзыяў. Ніякіх падставаў кагосьці асобна рэклямаваць у мяне няма.

А на разьвітаньне – сустрэчнае пытаньне: дарагі ананімны патрыёт "Нашай Нівы", вашая дзіўная лёґіка прымусіла мяне задумацца, што сябе вы, наракаючы на адзіных і непаўторных, пэўна, лічыце банальным і прымітыўным... І, відаць, таксама тут маеце рацыю, бо вас, прымітыўных ананімаў, процьма, а я, Мартыненка, адзін. Я ніколі не саромлюся паставіць сваё прозьвішча пад сваім тэкстам, пад пытаньнем канкрэтнаму чалавеку. Isn't it?

Сярод запытоўцаў гэтага он-ляйну вы ўзялі прыклад ня з лепшых (як Зьміцер Сідаровіч, Алесь Аркуш, Вадзім Александровіч, якім ёсць чым ганарыцца), а з тых, хто імя нават ня мае, тым больш гонару. Яны часам нават маім імем падпісваюцца ў інтэрнэце. Ды нават блёґ стварылі дзеля шальмаваньня майго імя (дзякаваць Богу, польскія сябры дапамаглі зьвязацца з кампаніяй http://livejournal.com ды зьнішчыць фікцыю).

[02/08/2006, 11:55] **А чаму вы падкрэсьліваеце сваё паходжаньне з шляхецкага роду? Што вам асабіста гэта сёньня дае?**

Я не падкрэсьліваю, а проста канстатую. Вы ж не пытаецеся, чаму я падкрэсьліваю, што я журналіст, што нарадзіўся ў Менску, што я Мартыненка нарэшце, які не задае такое ж дурное пытаньне вам: чаму вы падкрэсьліваеце сваю поўную безыменнасць? А што да шляхетнасьці, дык тут няма чаго бянтэжыцца. Але справа ў тым, што ў нас зьявілася шмат таварыстаў беларускай шляхты, якія акурат і дакараюць мяне: маўляў, ты несапраўдны шляхцюк, бо ў цябе па матчынай лініі, а мы сапраўдныя, у нас па бацькавай. Я кажу: хлопцы, вы шануйце дух шляхетны, каб у вас захаваўся, а тое, што вы валодаеце роднай мовай толькі цераз слоўнік ды ня можаце нават зразумець сутнасць сваёй Радзімы, у чым яе праблемы – гэта проста бяда ваша, а не шляхетнасць. Таму магу тут толькі адно падкрэсьліць: мне гэта нічога не дае. Гэта проста прыналежнасць да пэўнага роду. Гэта ёсць і гэта грэе творчую душу.

Я ня ведаю, адкуль у мяне гэтая энэрґетыка. Мне прапаноўвалі праекты: "Давайте, пишите по-русски, по-английски, мы вам заплатим хорошо". Ня хочацца. Ня ведаю. Я быў у Швэдыі, Нямеччыне, Італіі, Канадзе,.. у прынцыпе, я рады толькі таму, што вяртаўся ў Беларусь і заставаўся беларусам, хаця гэта нібыта матэрыяльна невыгодна. Так што прычына, напэўна, у той самай шляхетнасьці – калі ёсць што падкрэсьліць, тое й варта падкрэсьліваць... А я вырашыў, што трэба хоць сабе даваць справаздачу, адкуль гэта. Магчыма, ад шляхетных продкаў. Тым больш, ведаючы свае карані, я ня бачу ніякіх прычынаў саромецца гэтага ды хаваць, як нас школа вучыла. Навошта саромецца таго, чым варта ганарыцца? Зрэшты, вы, калі жадаеце, саромцеся, як і свайго імя саромецеся, а я ня буду. Бо я – Вітаўт Мартыненка, нашчадак роду Галімскіх.

[02/08/2006, 12:06] **Ці нармальна, на ваш погляд, тое, што некаторыя гурты перакладаюць тэксты сваіх песень на родную мову толькі дзеля радасьці патрапіць на "БАСовішча",**

**ня маючы нават уяўленьня, пра што яны сьпяваюць... Альбо таму, што сьпяваць па-беларуску модна... Дзякуй. Raman, Warszawa.**

Разумееце, ёсць такія людзі, якія ва ўсім шукаюць падвоху. Напрыклад: няўжо вы лічыце, што чалавек саступіў бабулі месца ў аўтобусе толькі дзеля таго, каб яго пахвалілі? Ня трэба так думаць. Вось і гурты перакладаюць на родную мову – радуйцеся. Іншая праблема, калі заканчваецца "БАСовішча", і яны вяртаюцца дамоў ды зьневажаюць само гэта "БАСовішча", як было з гуртом "Джытэр", з гуртом "Таксі" – вось гэта праблема. На жаль, такая наша краіна, што спачатку многія робяць на чужой мове. І дай Бог лепшым вярнуцца ў родную. Якім шляхам – няважна, абы вярнуцца. Вось, напрыклад, мяне асабіста лёс зьвёў з гуртом "P.L.A.N.", які таксама перакладаў шмат што, і хоць яго ні разу не запрашалі на "БАСовішча", ён працягвае рэальны беларускі шлях. Ён ужо ня толькі перакладае й далей свае іншамоўныя песьні, але й піша новыя беларускія песьні ды выдае ўжо шосты цудоўны альбом (на той час).

[02/08/2006, 12:31] **Вітаю! Ці ёсць пляны стварыць прыватны музэй беларускай рок-музыкі? Алесь Аркуш.**

Пра музэй мы сапраўды думалі – размаўлялі й з Алесем Аркушам у Наваполацку, дзе шмат цудоўных экспанатаў, а часьцей – з Анатолем Мяльґуем, зь якім пісалі ўсю гэтую нацыянальную рок-гісторыю. Музэй варта стварыць, але нядаўна я заўважыў, што экспанаты сыходзяць з рук. Нядаўна нейкая суполка беларускіх студэнтаў папрасіла мае прыватныя дзёньнікі, сшыткі. А я ім даў яшчэ й сваю рокерскую куртачку з надпісам "Я – беларус!" (глядзіце фота з Анатолем Сысам у сквэры Янкі Купалы) Фірмовая куртачка – там ляґатыпы беларускіх гуртоў: "Мроя", "Бонда", "Мясцовы час", ёсць і "Блэк Сабат". Цяпер гэтую куртачку нехта бачыў у нейкай залі тыпу музэя. А сама ініцыятыва музэю пакуль дрэмле.

[02/08/2006, 12:34] **Спадар Вітаўт, ці праўда, што Кастусь Акула зьяўляецца Вашым сваяком? Як да выданьня Вашай першай кнігі "Праз рок-прызму" спрычыніўся спадар Акула?**

Кастусь Акула быў рэдактарам таго тома, і толькі там мы зь ім пазнаёміліся. Сваяком ён ніколі мне ня быў, але старэйшым настаўнікам і арыентырам паводле стылістыкі ён шмат на што ў маіх тэкстах паўплываў. Чалавек унікальны, я яго вельмі паважаю. Цікавая штука: калі ён прыяжджаў у Беларусь у 1993 годзе, на маё, дарэчы, запрашэньне, і тут сустракаўся з сваімі сапраўднымі

сваякамі – я зь імі таксама пазнаёміўся. І вось ягоныя сваякі ўсё ніяк не маглі загаварыць па-беларуску. Ён тады аднаму й кажа: калі ты хочаш, каб я табе спадчыну нейкую пакінуў, дык гавары на нармальнай мове. Той усё адно гаварыў па-расейску. Тады Акула перайшоў на анґельскую, а сваяк анґельскай ня ведаў. Было весела назіраць за гэтым: чалавек на хаду дзеля грошай праз пакутлівую напругу рабіўся беларускамоўным. На жаль, мы не сваякі з Кастусём Акулам, хоць надзвычай блізкія паводле жыцьцёвых прынцыпаў. Бо ў яго нават сабака быў беларускамоўным (і анґельскамоўным). Чытайце пра гэта ў ягонай кнізе "Ўсякая ўсячына" (1984).



Вітаўт Мартыненка, Анатоль Сыс, Галіна Прыма, Анатоль Мяльґуй сярод беларускай інтэліґенцыі на мітынґу ў сквэры Янкі Купалы, 1989 г.

[02/08/2006, 12:39] **Якая Ваша дзясятка найлепшых беларускіх гуртоў усіх часоў?**

Трэба падумаць, але наўскідку: "Бонда", "Мроя", "Тэзаўрус", ":Б:Н:", "P.L.A.N.", "Partyzone", "Крама" – тое, што першае прыходзіць у галаву. Я штосьці-небудзь забудуся – напрыклад "IQ-48" – бо ня слухаю гіп-гоп, але ён бы мог увайсьці ў любую дзясятку, каб вырашаў не адзін чалавек. Леґенда – "Kriwi". О, а сярод першых варта й "Ulis" назваць! Дый без "Песьняроў" ніяк не

абыйдзесься, хоць не агулам. Ну вось ужо адзінаццаць... Можна падрыхтаваць сьпіс, але ён будзе няшчыры. Тое, што я цяпер спантанна назваў – гэта найбольш шчырая адзнака.

[02/08/2006, 13:07] **Вы кажаце: энэрґетыка ў беларускай музыцы! Вакалаў нармальных няма!**

Я, магчыма, пагаджуся, што над вакалам не працуюць, але... Заплаціце музыкам зарплату, і яны будуць спакойна шліфаваць свой вакал! Але рэальна быў вакал у "Тэзаўруса" – проста ўнікальны. І як яго ўшанаваў наш шоў-бізнэс?.. Цяпер гэты унікальны талент ужо кінуў музыку, бо хату трэба будаваць...

[02/08/2006, 13:09] **Які цяпер у беларускіх рок-гуртоў можа быць нармальны стымул для творчасьці, акрамя голага патрыятызму, якім не пракормісься?**

Акурат у гэтым праблема. Але й тут ня ўсё адназначна. Стымул вось зьявіўся ў польскага року – дык яго нецікава цяпер слухаць. Мы жывем – вось галоўнае! Мы маглі нарадзіцца 20-гадовымі і 20-гадовымі памерці. А шчасьце ў тым, каб нарадзіцца бязмозґлым, а потым набрацца розуму і памерці мудрым. Так што ідзе нармальны працэс, які мае назву ЖЫЦЬЦЁ...

[02/08/2006, 14:00] **Мы заканчваем нашу онляйн-канфэрэнцыю. Вэб-рэдактар.**

Вельмі ўдзячны ўсім за цікавыя, зьмястоўныя, разнастайныя пытаньні.

# Права быць Беларусам

**Вы слухаеце радыё "Свабода" з Прагі. Да канца нашага этэру засталася гадзіна, і вас чакае "Начная Свабода": начны госць, начныя рэпартажы, начныя апытаньні на вуліцах беларускіх і эўрапейскіх гарадоў, агляд інтэрнэту, навіны культуры ды вашыя званкі й SMS-паведамленьні.**

**Правядзіце апошнюю гадзіну сёньняшняга дня (02.VIII.2006) з "Свабодай".**

**На хвалях "Начной Свабоды" з вамі Аляксей ЗНАТКЕВІЧ.**

**Госьць нашай сёньняшняй праґрамы – музычны журналіст Вітаўт МАРТЫНЕНКА[47].**

**Нядаўна ў Беларусі з друку выйшла кніга "222 альбомы беларускага року і ня толькі", якую ён напісаў разам з Анатолем Мяльґуем. Але найперш пра асноўныя падзеі ў Беларусі й у сьвеце. За імі сочыць Тацьцяна Поклад...**

*(Пасьля навінаў – песьня "Ой, Дуся, Дуся" гурта "P.L.A.N. " з альбому "Вам слова, Джон Ячмень!", 2003).*

***Аляксей Знаткевіч:*** **Гурт "P.L.A.N." сьпявае песьню "Ой, Дуся, Дуся" на вершы Вітаўта Мартыненкі. Наш сёньняшні госьць – музычны журналіст Вітаўт Мартыненка, аўтар тэкстаў ня толькі гэтага гурту, але яшчэ такіх камандаў, як "Tesaŭrus" ці "Deadmarsh". Сёньня ўдзень Вітаўт Мартыненка адказаў на пытаньні наведнікаў нашага сайту. Гэтыя адказы вы можаце прачытаць на адрасе www.svaboda.org А цяпер ён з намі на сувязі зь Менску. Вітаўт, добры вечар!**

**В.М.:** Добры вечар, Аляксей!

***Аляксей Знаткевіч:*** **Вітаўт, знакамітаму рок-музыку Фрэнку Запу прыпісваюць такі жарт: пісаць пра музыку – гэта ўсё роўна, што танчыць пра архітэктуру. Вы як музычны журналіст, музычны крытык, ці часта адчувалі, што вам бракуе словаў, сродкаў, каб нешта распавесьці людзям?**

**В.М.:** Мне здаецца, што Фрэнк Запа, відаць, сербануў піва, перш чым гэта сказаў. Мо тое проста быў такі дзіўны жарт. Але рэальна любая зьява паддаецца Слову. У чалавечым існаваньні вышэй толькі Слова. Яно фармуе сам дух чалавечы (добрае Слова крыніца добрага духу, чужое слова – крыніца чужога духу). І калі нейкая зьява не атрымала вэрбальнага асэнсаваньня, г.зн. асэнсаваньня ў словах, значыць яе проста не было. Таму я й пішу пра музыку ды для многіх адкрываю, што ёсць такая зьява – Музыка.

***Аляксей Знаткевіч:*** **Вы лічыце, што ўсё, абсалютна ўсё можна пераказаць словамі. І вытлумачыць словамі. Любыя зьявы?**

**В.М.:** Татальна ўсё. Ня ўсё можна выказаць музыкай, танцам (вунь жа й жартаўнік Фрэнк Запа ня верыць, што бываюць танцы пра архітэктуру), але Слову паддаецца ўсё.

***Аляксей Знаткевіч:*** **Такім чынам Слова, на вашую думку, – яно вышэй за Музыку?**

---

[47] Тэкст гэтага інтэрвію неўзабаве зьявіўся ў папяровай публікацыі на старонках беластоцкага штомесячніка "Czasopis" №1 (05.01.2007).

**В.М.:** Ня толькі на маю: "Напачатку было Слова і Слова было ў Бога. І Богам было Слова". Карацей, Слова – гэта сынонім Бога. Ці будзеце аспрэчваць Біблію? А гэта Кніга кніг.

***Аляксей Знаткевіч:*** **Сёньня ж падчас он-ляйну вы назвалі шэраг беларускіх музычных праектаў нацыянальна мёртвымі. У тым ліку "Drum Ecstasy", гурт, які грае чыста інструмэнтальную музыку, бяз словаў. А як вы вызначылі вось гэтую "нацыянальную мерцьвячыну" ў дадзеным выпадку?**

**В.М.:** Музыкант хоць неяк, і, дарэчы, ўсё адно праз Слова, даносіць сябе. І ў назьве сваёй, і ў назвах сваіх твораў. Што да "Drum Ecstasy", дык у сутнасьці іхніх кампазыцыяў няма нават думкі пра Беларусь. Якая там думка? Там ёсць адчуваньне падзеяў, якія адбываюцца ў краіне? Там ёсць проста клясныя музыканты, выдатныя рамесьнікі. Гэтага мала, каб выказаць беларускую сутнасць. Вось вазьміце Агінскага: яго то да палякаў залучаць, то да французаў, то да беларусаў – хто як заграбе. Але ж акурат гэты чалавек нават у інструмэнтальнай музыцы здолеў выказаць пачуцьці пэўнага краю. Возьмем славуты палянэз "Разьвітаньне з Радзімай": кампазытар жа выразна намякнуў ім, што ў мяне таксама ёсць Радзіма. І думайце пра яе. Што сказалі нам, вам, мне "Drum Ecstasy"? Ды няма для іх нічога: ні Радзімы, ні Лукашэнкі, каторы іх, дарэчы, забараніў, ні гісторыі гэтага краю, ні сучасных змагароў, ні праблемаў роднай мовы. Няма ніякага адчуваньня Беларусі нават у імені сваім, хоць адчуваньне футбола, пэўна, ёсць.

***Аляксей Знаткевіч:*** **Гэта вы ведаеце з асабістых гутарак зь імі ці паслухаўшы іхную музыку, дзе барабаны там і...**

**В.М.:** Гэта я ведаю найперш ад іхняга імя: не "Барабанны экстаз", а "Drum Ecstasy". Да таго ж чуў неяк іхнія п'ескі "Футбол", "Сьвісткі". Мне было дастаткова, каб зразумець, што для мяне, беларуса, гэта нуль. Ня тое, каб я казаў, што гэта кепска сыграна. Проста аб'ектам маёй увагі зьяўляецца не ўпакоўка, а зьмест.

Мне нецікава назіраць, калі той, каму няма чаго сказаць людзям, гуляецца ў малпаваньне сусьветных куміраў. Дарэчы, пра іншыя інструмэнтальныя праекты: ёсць у нашай кнізе такі Сяржук Трухановіч. На ягоным дыску таксама ніякіх песень. Ґітарная музыка. Але там назвы: "Асуджаны да жыцьця", "Нараджэньне таямніцы", "Менск-Мадрыд", "Купальская"... Не "Рождение тайны", заўважце, а "Нараджэньне таямніцы". Не "Коррида", а "Купальская". Ці могуць быць сумненьні, што тут беларус гаворыць зь беларусам, з сьветам. Сяржук проста жыве ў гэтым кантэксьце, таму й музыка ягоная набывае іншы кантэкст.

А размаўляць з "Drum Ecstasy" мне пра што? Пра тое, што гэтае пастукваньне кіёчкаў па бубнах называецца "The very best music", а тое – "Early Morning"? І што пасьля гэтага – ісьці ў міліцыю ды пытацца: "Скажыце, а прапіска ў іх менская?" О! Дык гэта, аказваецца, беларуская музыка ў такім выпадку была!!! Мне хацелася б пазнаваць музыку без умяшальніцтва міліцыі. Іншымі словамі: беларускую музыку я чую на слых, а не на спраўджаньне пашпарту.

Нас і так у маскульце разводзяць чужынцы ліпавай беларускасьцю: Зьміцер Безкаравайны з Тулы, Толя Кірушкін з Саратава, Алег Клімаў з Караґанды (апошні хацяб ня хворы на ваяўнічасць) любяць час ад часу сказаць нашай публіцы: "Ну какая разница, на каком языке белорусская песня, всё равно же понятно". А якасць песьні не вымяраецца крытэрамі "Понятно – не понятно". Песьня насычае чалавека адпаведным духам: чужая мова песьні – чужы дух. Вось і зьяўляюцца такія патрыёты, якія нават назву беларускую свайму твору не дадуць, нават кантэкст родны не абазначаць. А інструмэнтальны твор "Drum Ecstasy", здавалася б, яшчэ прасьцей абазначыць. Ды ня трэба ім гэта. І ў выніку... Яны не патрэбны нам, журналістам, бо цікавыя хіба толькі ўзброеным пёрамі аґентам каляніяльнага ўплыву.

Тут памірае этнас, а мастацтва... Яно як доктар, каторы п'е піва, пакуль хворы памірае. Вы будзеце спадзявацца на такога доктара? Вось і я не спадзяюся на мёртвае мастацтва. Дый не забывайце: выдатнае рамесьніцтва і выдатнае мастацтва – паняткі кардынальна розныя. Хто зразумее гэта, таму мой клопат пра паміраючае мастацтва ня будзе ўяўляцца зьнявагай рамесьнікаў. А наконт жывога мастацтва, ну як не прыгадаць тут неўміручыя радкі канадзкага беларускага пісьменьніка Кастуся Акулы на гэтую тэму: "Чужая моўная плынь заваліла старую мяжу і ўварвалася ў краіну разам з тымі магутнымі танкамі ды абшмулянымі хамутамі й стрэльбамі на вяровачках зь пянькі".[48]

***Аляксей Знаткевіч:* Вітаўт, падчас сёньняшняй он-ляйн канфэрэнцыі вы таксама сказалі, адказваючы на адно з пытаньняў: "Чалавек у любым кутку плянэты духоўна сілкуецца ТОЛЬКІ СВАІМ, а чужое слухае толькі дзеля знаёмства альбо параўнаньняў". Але напрыклад тая ж рок-**

---

[48] *Цытуецца паводле выданьня:* Кастусь Акула "Гараватка": кніга 2-я "Закрываўленае сонца" з ілюстрацыямі Міхася Наўмовіча, (Toronto, выдавецтва "Пагоня"/"Greenwood Ltd.", 1974, стар. 245).

**музыка: яна не ў Беларусі нарадзілася, і пэўна тыя, хто яе пачынаў рабіць, таксама ня толькі сваім – так бы мовіць – сілкаваліся. Гэта значыць "Beatles" ці,.. я ня ведаю... "Led Zeppelin" былі для іх сапраўднымі арыентырамі...**

**В.М.:** Дык натуральна – арыентырамі, вехамі параўнаньня. І акурат такое параўнаньне зьмяняе формы, а потым надыходзіць час для асэнсаваньня сутнасьці. Кажучы, што рок-музыка нарадзілася не ў Беларусі, мы ня можам сцьвярджаць, што яна нарадзілася ў Амэрыцы або ў Вялікабрытаніі. Таму што без афрыканскіх мурынаў гэтай музыкі не было б ні ў Брытаніі, ні ў Амэрыцы. Кожны дадае нешта сваё. Такім чынам, дзе яна нарадзілася, ніхто ніколі дакладна ня скажа. І яна надалей нараджаецца... і ў Афрыцы, і ў Польшчы, і ў Амэрыцы, і ў Вугоршчыне, і ў Брытаніі. Ці будзе чуваць у ёй беларуская нотка? Так што: дзе нарадзілася музыка – ня нам вырашаць.

***Аляксей Знаткевіч:*** **Але вы гаворыце: "Людзі сілкуюцца духоўна ТОЛЬКІ СВАІМ". Ці можна сказаць, што рок-музыка – гэта ўжо СВАЁ для Беларусі? Калісьці ж яна была чужым.**

**В.М.:** Справа ў тым, што слухаць і духоўна сілкавацца – гэта розныя рэчы. Слухаем мы ўсё, а вось ці сілкуемся ўсім, што слухаем? Тое, што ў нас зьявілася рок-музыка – гэта ня сьведчыць, што мы зразумелі таго ж Фрэнка Запу ці любога іншага замежнага музыку. Я вось, напрыклад, увесь час вельмі любіў "Led Zeppelin", "Uriah Heep", але ня думаю, што я іх да канца разумеў. І гэта я кажу пасьля таго, калі нават сам нядаўна скрупулёзна зрабіў пераклад на беларускую "Lady In Black" для гурта "P.L.A.N." (шукайце ў пятым альбоме "Шлях да каханай", 2007). Ня дадзена чалавеку да канца прасякнуць чужое.

У нас кажуць часам: "Вось Аляксей Казлоўскі так дасканала ведае анґельскую мову – лепш за беларускую". Але тое, што ён піша на анґельскай мове, анґельцам не цікава слухаць. Там няма вобразаў, мэтафараў. Для прыкладу, як мы кажам на кепскага чалавека? Гэй, ты, казёл. У найбольш дасканалым перакладзе тут атрымаецца проста жывёліна, а характарыстыка чалавека цалкам зьнікне або трансфармуецца. Ну расшыфруйце мне вобраз пясочнага чалавека ў песьні гурта "Metallica"? У сваім перакладзе для гурта "Deadmarsh" я замяніў яго вобразам сну... Так што да канца зразумець чужое ня дадзена нікому. Зьняць формы? Дадзена. Пры параўнаньні. Але многія ў нас толькі й імкнуцца здымаць формы. Сёй-той, праўда, спрабуе ўжо насычаць тыя формы сваім зьместам. Мы з Анатолем Мяльґуем у нашай кнізе

аналізуем акурат тую музыку, дзе ў чужыя, інтэрнацыянальныя формы ўжо ўнесены нацыянальны кантэкст.

***Аляксей Знаткевіч:*** **Я нагадаю: з намі на сувязі зь Менску – Вітаўт Мартыненка, беларускі музычны журналіст, аналітык. І неўзабаве мы акурат пагутарым пра кнігу "222 альбомы беларускага року і ня толькі", якую ён напісаў разам з Анатолем Мяльґуем. А пакуль давайце паслухаем Міхала Клеафаса Агінскага...**

**Гэта быў ня той, найзнакамітшы, але палянэз Міхала Клеафаса Агінскага, у якім таксама чуліся беларускія матывы.**

**З намі зноў на сувязі зь Менску Вітаўт Мартыненка. Нядаўна з друку выйшла ягоная з Анатолем Мяльґуем кніга "222 альбомы беларускага року і ня толькі". І я памятаю ў часопісе "Крыніца" неяк пыталіся, якія дыскі вы б узялі з сабой на бязьлюдны востраў. Дык вось пытаньне й спадару Мартыненку: якія б альбомы беларускага року,.. ну не 222, а хаця б 2-3, вы абавязкова ўзялі б на бязьлюдны востраў?**

**В.М.:** Дарэчы, нярэдка пра гэта сам думаю. Але не пра выбар, а вось пра што... Я цяпер моцна пакрыўджаны на гурт "Tesaŭrus". Яны мяне ўразілі, калі яшчэ былі рускамоўнымі. Я ім растлумачыў, як яны марнуюць свой талент, і яны вельмі хутка згадзіліся перайсьці на родную мову, выдалі цудоўны альбом "Аднова тэзаўруса", але... Іх не прыняла беларуская тусоўка (менавіта тусоўка, а не народ): іх праіґнаравала "БАСовішча", іх выкінулі з усіх прэстыжных беларускіх CD-складанак (за выключэньнем хіба "Ґенэралы айчыннага року")... Іх ніхто ня браў пад увагу. Цяпер гэта анґламоўны гурт, які шукае іншы хаўрус, але я... Вось падыходжу да сваёй фанатэкі, і першы дыск, які заўважаю, гэта акурат вось "Tesaŭrus", адзіны іхні альбом: беспадобны вакал, цёплыя мэлёдыі, але...

***Аляксей Знаткевіч:*** **А на якой мове гэты іхні альбом?**

**В.М.:** Альбом цалкам беларускі. Тое ж і шкада, што такое зьнішчылі самі беларусы, даручыўшы засланцам даглядаць за такім скарбам. Там з гурта застаўся адзін чалавек, усе разьбегліся. Яны не знайшлі сябе, а таленавітыя вельмі моцна. Яны мяне надзвычайна ўразілі, найярчэйшае адкрыцьцё за апошні час. А ў славутым "Тузіне гітоў" ніколі не было іхніх гітоў, дзякуючы ўмелым гульням вядоўцаў. У нас няма нацыянальных крыніцаў музычнай інфармацыі, якія здолелі хаця б цьвяроза зразумець гэтую фатальную катастрофу: мы нішчым нацыянальныя таленты, і ёсць каму дапамагчы ў гэтым, таму нацыя мае

марґінальны характар. Можа, проста мяне не разумеюць пэўныя дамарослыя адмыслоўцы...

Ну дык вось, "Tesaŭrus" усё адно для мяне адзін зь першых. Дый без "N.R.M." наўрад ці абыйдзесься, бо гэта рэальны носьбіт нацыянальнай ідэі, які сілкуе мой дух. Безумоўна, штосьці з гурта "P.L.A.N.", гэта таксама носьбіт. Праўда, я зь ім супрацоўнічаю, але супрацоўнічаю менавіта таму, што ён мне моцна падабаецца. Нават больш за славутую "Краму", бо стыль адзін, але тут больш чыстыя тэксты, больш выразныя. І гэта я кажу не пра свае тэксты, а пра ўвогуле паэтычны выбар гурта: Андрэй Плясанаў, ягоны лідэр, выбірае тэксты вельмі мэлядыйныя, якія да таго ж шмат гавораць. І Андрэя Бурсава, і Сяргея Законьнікава, і пераклады клясыкаў – Робэрта Бёрнса, Юліяна Тувіма... Вельмі высокая паэзія. Безумоўна, я таксама рады, што й мае вершы там трохі ўпісаліся.

Што яшчэ ўзяць? О, а як жа я забыў пра "Ulis", толькі для такога выпадку выбраў бы раньні "Ulis", бо ён мацней за цяперашні. Ну вось такі выбар.

***Аляксей Знаткевіч:* А зараз мы паслухаем кароткае апытаньне. Наш карэспандэнт пытаўся людзй на менскіх вуліцах, якія беларускія гурты ім цяпер найболей падабаюцца?**

***Галасы вуліцы:***

** Раней я слухала "N.R.M.", таму што музыка такая даволі цікавая, ну і тэксты своеасаблівыя, а зараз трохі адыйшла ад гэтага, і нічога сказаць, да жалю, не магу. Я зараз перайшла да больш клясычнай музыкі, таму не кампэтэнтная ўжо ў актуальных навінках.*

** Мне нравится группа "Механика", у них очень классные песни. Ну, также нравятся просто исполнители многие. "Сябры" тоже очень хорошая группа, песни у них такие патриотические.*

** "Зьмяя"! Таму што гэта вельмі праўдзівы гурт. Яны пяюць пра нашае жыцьцё. І там вакалістка – дзяўчынка вельмі сімпотная.*

** "Крама", ":B:N:", "Стары Вольса", "N.R.M."... Падабаецца, што яны сьпяваюць па-беларуску, а таксама іхні імідж, іхняя стылістыка – рок, фольк. Вось гэта падабаецца.*

** "J-Морс", "Tesaŭrus", таму што гэта рэдкія прыклады, калі на беларускім музычным рынку спрабуюць рабіць нешта накшталт эўрапейскага саўнду.*

** "N.R.M.", "Neuro Dubel", "P.L.A.N." – вось галоўныя.*

** Беларускія? А я беларускія гурты ня слухаю.Мне такое не падабаецца.*

*Аляксей Знаткевіч:* **З намі на сувязі зь Менску паранейшаму Вітаўт Мартыненка, музычны журналіст, аналітык. Я нагадаю: сёньня ён адказваў на пытаньні наведнікаў нашага інтэрнэт-сайту. Гэтыя адказы вы можаце прачытаць на адрасе www.svaboda.org**

**Спадар Мартыненка, цяпер да вас некалькі такіх больш асабістых пытаньняў: вы ад нараджэньня атрымалі імя Віктар і толькі ў сярэдзіне 80-х абралі новую форму самавыяўленьня – Вітаўт. Для вас гэта было як другое нараджэньне?**

**В.М.:** Магчыма, так. Проста, вось як гэта адбылося: я ніколі бацькоў не пытаў – як назвалі, так і назвалі. Не было праблемаў. Але ў той час мая цётка Яніна, якая жыла ў Ратамцы пад Менскам, паўстала перад пытаньнем, як назваць унучку. Ейная дачка хацела назваць сваё дзіцё ў ейны гонар – таксама Яніна, але ў ЗАГСе запярэчылі: "Такога імя не існуе (?!!), таму мы запішам проста Ніна, а дома вы клічце, як сабе хочацца". Яны ціхмана згадзіліся, але я як пачуў, дык проста стрымацца ня мог: "Як вы стрывалі, як гэта можна? Няўжо вачам сваім ня верылі, што ваша маці Яніна жывая й натуральная?"

Тады й бацькоў сваіх пытаюся,.. дакладней, толькі маці ўжо засталася: "А як у нас было?" Тая адказвае: "Што ты, сынок, ніякіх нестандартных імёнаў не дазвалялася. А стандарт – толькі ў расейскім слоўніку. Іначай, то нацыяналістамі назавуць, то атшчэпенцамі, то проста пшэкамі праклятымі". А маці мая Рэґіна (каралева), акурат з імем сваім напакутвалася. Бо ня рускае. Усё трэба было ў Беларусі называць па-расейску. І вось наш цяперашні сярэднестытыстычны стандарт – гэта ўсё-ткі рэальная праблема ґвалтам насаджанага стэрэатыпу.

І акурат з таго часу я пачаў змагацца хаця б за беларускі псэўданім – Вітаўт. Цяжка гэта давалася, бо акурат Вітаўт чамусьці аж надта зацята не прапускалі ў друк. Памятаю, першы раз прайшло як жартоўны подпіс да нейкага фэльетона ў "Вожыку" – Вітаўт Мартыненка-Прыняміжны (я быў пры "Нямізе", так рок-клюб мы назвалі, што стварылі з Мяльґуем). А ў сатырычных рэчах чамусьці хоць назавіся Чамадан Кандратовіч – гэта пройдзе. Так што й Вітаўт прайшоў у выглядзе Чамадана, а пасьля таго я, спасылаючыся на прэцэдэнт, пачаў яго часьцей і часьцей ужываць, прызвычайваючы сыстэму да ўспрыйманьня беларускіх імёнаў.

*Аляксей Знаткевіч:* **Я хацеў бы сказаць дзеля справядлівасьці, што й Віктар жа – не расейскае імя, яно**

**інтэрнацыянальнае, альбо лятынскае. Яго ўжываюць і Гішпанцы, і Чэхі, і Французы.**



Альдона – дачка Вітаўта. Гістарычны фэст у Заслаўі (02.06.1996)

**В.М.:** Натуральна. Ды нават імя Алесь мае пэўныя карані з міжнародным Аляксандрам, Алексам. Як і вашае Аляксей. Гэта ўсё з адной крыніцы. Але зьвярніце ўвагу на варыянты імёнаў. Беларускія варыянты чамусьці нейкія неафіцыйныя. Акурат, дарэчы, цяпер я змагаюся, каб імя Вітаўт мне дазвалялі пісаць зь беларускім кантэкстам і ў расейскіх ґазэтах: не Витольд і не Витовт, а Витаут. Імя ў нас – гэта сутнасць нацыянальная. Яна павінна быць бачная ў самім напісаньні. Калі нацыянальнай адметнасьці няма, значыць гэта навязанае: хоць Віктор Гюго, хоць Віктар Скорабагатаў... Я не дакараю ґеніяльнага барытона, але сам палічыў патрэбным адмовіцца нават ад Віктара. Нармальна, Пераможца, я разумею гэтае слова, але мне хацелася б заглыбіцца ў нацыянальную гісторыю, каб гэта страляла. А ўжо дачку сваю я сьвядома назваў Альдонай, перамогшы нават чарговае супраціўленьне ЗАГСа, каб ніхто й не спрабаваў перайначыць, бо ейнага стрыечніка, якога назвалі й запісалі Янам, усюды пыжуцца назваць Ванюшам.

***Аляксей Знаткевіч:* А якога паходжаньня імя Альдона? Што яно азначае?**

**В.М.:** Я проста калісьці ў юнацтве сабраў вялікую калекцыю польскіх дыскаў 80-х. Любіў польскі рок, але былі й іншыя кружэлкі. Напрыклад, сатырыкі Ян Петшак і Пётр Франчэўскі (Franek Kimono), у якіх была такая інтэрмэдыя: "Як завуць жонку пана? Альдона? А навошта сапраўднаму паляку жонка з такім старалітоўскім імем?" Тады я падумаў: аказваецца гэта ня польскае імя? А ў мяне ж было шмат знаёмых Альдонаў у Польшчы. Аказваецца, палякі ня лічаць гэта сваім. Палез у нейкія

гістарычныя даведнікі й знайшоў: была ў нашага вялікіга князя – ці то Гедыміна, ці то Ягайлы – дачка з імем Альдона, у Віцебску жыла. Дарэчы, стала каралевай Польшчы, але там яе перахрысьцілі ў Анну (так што таксама нюанс). І я падумаў: вось, Альдона – гэта наша. Жонцы таксама спадабалася.

Мы абодва хацелі, каб наш брэнд і брэнд нашых блізкіх выразна паказваў: мы беларусы. Цікава, што пасьля мяне многія мае менш зацятыя знаёмыя, якія нават беларускай мовы яшчэ ня ведалі, прасілі ў мяне тую кнігу зь беларускім іменьнікам, дзе я знайшоў Альдону, і знаходзілі для сваіх дзяцей вельмі яркія імёны: то Аліна, то Францішак, то Ружана (бегаюць цяпер гэтыя носьбіты цуду па менскіх вуліцах)... Гэта таксама быў іхні крок у жывую Беларусь. А сыстэма ж супраціўлялася: нам казалі, "какая разница", а самі навязвалі сваё. Мне нярэдка казалі: "Гэй, ты, МартыненкО, ты хахол". Я нічога ня маю супраць украінцаў, бо прапрадзед па бацьку быў акурат з Чарнігаўшчыны, але я – беларус, таму змагаюся нават за свой беларускі канчатак на расейскай мове: не МартыненкО, а МартыненкА. Каб прымусіць паважаць беларуса. Як мой адзін школьны сябра яшчэ ў пятым клясе настойваў: я не Грудзінко, а Грудзінка, вось я (і біў сябе ў грудзінку кулаком).

Цікавая рэч – адносіны да прозьвішчаў: беларус Іваноўскі парасейску будзе Ивановский, а паляк Iwanowski там жа будзе чамусьці Ивановски. Не дадаецца ніякага Й. Чаму? Ды проста беларусаў можна не лічыць за людзей, а палякаў трэба лічыць, бо ключ ад сваёй хаты знайшлі. Я акурат мяркую, што й беларусаў трэба лічыць за людзей.

***Аляксей Знаткевіч:*** **Дзякую. З намі на сувязі зь Менску быў музычны журналіст, аналітык Вітаўт Мартыненка. Дзякуй вам вялікі за гутарку.**

**В.М.:** Дзякуй і вам.

***Аляксей Знаткевіч:*** **Ну а зараз – песьня гурту "Partyzone", якому Вітаўт тэкстаў не пісаў, але, прадаўшы машыну, уклаў немалыя грошы ў раскрутку іхняга дэбютнага альбома "Трэба рабіць".**

# "222 альбомы" или Fuck от Плесанова,

## альбо Як расьсяваюцца вірусы

**Rider** ® 04.02.08, 11'57 – Не так давно в Минске была официально объявлена эпидемия гриппа со всеми вытекающими от сюда *(**В.М.** От какого СЮДА, грамотей?)* последствиями (продавцам рынков, например, в обязательном порядке посоветовали носить хирургические маски на лице). Однако, несмотря на опасность заражения вирусом, зал театра-студии «Зьніч» в подвале Красного костёла на площади Независимости 3 февраля был заполнен зрителями до отказа. Там состоялась презентация книги «222 альбомы беларускага року» Витаута Мартыненки и Анатолия Мельгуя.

Несмотря на то, что книга была издана уже года полтора назад, эта акция, организованная Виталием Супрановичем, была своеобразным пиар-ходом, направленным скорее всего на продажу оставшегося тиража книги, которая раскупалась до этого весьма вяло *(**В.М.** А цифры? Почему вместо фактов – досужий вымысел? Ведь иожно было сообщить и о запуске второго тиража ради объективности)*. На входе как всегда стояли уже известные в узких кругах продавцы и распространители этой самой «запрещённой» продукции. Цены на которую, кстати, были не маленькие *(**В.М.** Ну не рецензия на концерт, а – ни дать, ни взять – донос ретивого сотрудника царской охранки. Но самое прикольное, редакция почему-то пропускает здесь забаненое для других слово Fuck, даже выносит в заголовок. Да и имя сквернослова, скрытого за вымышленной подписью Rider, им известно, о чём свидетельствует значок ®. Видимо, такой уговор: мы вам будем хамить по полной, а вы уж будьте культурными – даже не отмывайтесь. Это известная тактика оккупантов в чужой стране. Пожалуй, закономерный итог такой тактики – тотальное снижение тиража и закрытие газеты с января 2008-го. Теперь это – вот такие форумы-брехаловки, как этот, а в итоге – авторитет газеты-самоубийцы продолжает снижаться)*.

На сцене располагался стол, за которым сидели «виновники» торжества. В. Мартыненко был облачён в винтажный костюм явно доперестроечного покроя, Мельгуй же был как всегда серьёзен. Авторы поведали со сцены собравшимся о своём вкладе не только

в становление белорусского рока, но и независимости, всей национальной культуры и не больше, не меньше *(**В.М.** Ни больше, ни меньше, грамотей)* – во внедрение классического белорусского правописания под влиянием их статей.

В. Мартыненко посоветовал собравшимся не бояться разговаривать на мове *(**В.М.** ...Роднай! – какой подонок!)* и поправлять один одного, если услышат у друг друга неправильно сказанное слово или «русизм», при этом правда *(**В.М.** Запятые во вводном слове забыл, грамотей)* он очень рассердился, когда попытались поправить его самого. Нужно так же *(**В.М.** Так как же, грамотей?)* отметить, что авторы книги явно не готовились к выступлению заранее, от чего *(**В.М.** А насамрэч, ад чаго? Ці не ад сцэны?)* местами понять их сбивающуюся речь и уловить мысль в постоянно меняющихся темах разговоров было проблематично.

А. Мельгуй заявил, что они, в отличие от распускаемых их врагами слухах и сплетнях *(**В.М.** В отличие от чего – слухОВ и сплетЕН. Проблемы с логикой?)*, которых видно собралось много в зале *(**В.М.** Ну задзёўб ужо, дзе коскі на ўводным слове? Ты што: школу на трэцяй клясе кінуў? Вось на такіх аўтараў абапіраецца цяпер «Музыкальная газета». Дый з слухамі й плёткамі, сабранымі ў зале, гэты спэц перабаршчыў. Ну вядома ж, праблемы зь лёґікай. Далей я зусім спыняю правіць массу ягоных школьных памылак)*, не хвалят любую группу, только потому что она поёт на роднай мове. В качестве подтверждения он привёл недавнюю критику группы «Зьмяя», поскольку по их мнению, вокалистка слишком неответственно подошла к написанию текстов. В этом, по мнению Мартыненко, и заключается их культурологический подход к музыкальной критике.

Звучала также критика в адрес «белорусской попсы», которая поёт по-русски. Больше всех досталось почему-то Искуи Абалян *(**В.М.** А Райдер, видимо, в душе лелеял Нескули Подбаян?)*.

Также авторы книги воздали всяческие почести Виктора Супрановичу и его «БМАgroup» *(**В.М.** Цікавы тэксталяґічны прэцэдэнт, дзе аляґічны набор слоў выдае дыктант з чужых нататкаў: яму напісалі «почести Виктора Супрановичу», і Віталь з-за недагляду становіцца Віктарам, пэўна Мартыненкам, ад якога й сыходзілі почэсьці)*. По их словам, после издания нескольких виниловых дисков на фирме «Мелодия» их усилиями, в 1990-х белорусский рок не издавался вообще, и только благодаря стараниям Супрановича, стали выходить диски. То ли эпидемия гриппа, то ли что-то другое

заставило уважаемых критиков забыть фирму «Ковчег», на которой издавалось в 1990-е годы всё, от «Мясцовы Час», «Ulis», «N.R.M.» до проектов вроде «Народны альбом»...

Несмотря на всю весомость вклада ветеранов музыкальной журналистики в развитие белорусского рока, поддержать и поздравить их пришли звёзды отнюдь не первой величины *(**В.М.** Ой. а як жа мы самі плакалі наўпрост на сцэне, што не было Хлястова, Грыбалёвай і «Улялюм»)*. Не было даже группы «Партизон», для издания первого альбома которой В. Мартвненко продал свой собственный автомобиль.

К звёздам можно было отнести только Олега Хоменко, лидера «Палац». Олег, немного напоминавший беловежского зубра, вышел на сцену первым и исполнил классику из репертуара «Палац»: «Чужыя дзеўкі» и блестящую обработку песни белорусских повстанцев «Ой, каліна, праважала маці сына». Также хорошо выступил Яраш Малишевский, который представил на суд публики новую песню «Восеньская самота». Змитер Бартосик вышел с белорусскоязычными обработками песен Булата Акуджавы и Владимира Высоцкого, которые были им спеты в несколько приблатнённой манере.

Затем на сцене появился проект «Зигзаг», который исполнил всем известные звучащие по радио и ТВ англоязычные хиты *(**В.М.** Калі рэцэнзэнт глухі, дык дапаможа клініка. З трох нумароў «зіґзаґаўскага» сэту толькі паўпесьні былі па-анґельску, бо далей ішлі нашыя разважаньні, чаму на беларускіх інфармканалах фарматнымі становяцца толькі чужамоўныя творы)*. Правда, исполненные без электронных беков, только под гитару, они показали полную несостоятельность дуэта. Вокалист меланхолично гнусавил, представляя видимо, что он поёт как Дейв Гэхан из «Depeche Mode», однако то ли отсутствие голоса, то ли ужасный акцент не позволяли собравшихся *(**В.М.** Афіґенная лёґіка склонаў!)* с этим согласится. Усугублялось всё плохой дикцией и примитивной мелодикой.

Под конец, не дождавшись, что его позовут, на сцене материализовался Андрей Плесанов. Облачён был сей артист с ног до головы в камуфляж, от чего *(**В.М.** А насамрэч: ад чаго? Мо ад тэлефона)* у присутствующих в зале создалось впечатление, что, как это часто бывает на подобных акциях, вызвали ОМОН.

Андрей Плесанов в тот вечер взял на себя роль хедлайнера и исполнил более 10 песен. Это отчасти объясняется большой

любовью Витаута Мартыненки к нему, к тому же именно на стихи Витаута написано большое количество песен группы «P.L.A.N.»

А. Плесанов пел в типичной для него «истерично-проповеднической» манере, когда ближе к концу каждой песни, он переставал терзать струны гитары и продолжал петь, эффектно раскинув руки по сторонам. Не дать, не взять *(**В.М.** Тут, пэўна, устойлівая непісьменнасць)* – статуя мессии в Рио! Разойдясь, и, видимо желая показать, что он всё же не бард, а настоящий белорусский рок-н-рольщик, во время исполнения песни «Вялікае калі ласка!» он показал известный в рок-культуре жест – кулак с оттопыренным средним пальцем. Этот поступок в стиле «Sex Pistols» в стенах католической святыни, администрация которой так любезно предоставила помещение и аппаратуру под эту сомнительную акцию во время проведения на верху службы, выглядел по крайней мере хамством *(**В.М.** Збаў нас, Божа, ад такіх абаронцаў сьвятыні, якія ня грэбуюць хлусьнёй: там, дзе Плясанаў трымаў мэдыятар і ня мог аттапырыць палец, яны майструюць гучны Fuck у сьвятыні і ціпа змагаюцца зь ім).*

Исполнив на «бис» ещё несколько хитов «P.L.A.N.», отважный рок-н-рольщик удалился, а авторы и музыканты стали раздавать автографы желающим, коих было не так много...

**Com для Ridera** 04.02.08, 14'07 – А чё это было, мой далеко не юный друг? Камуфляж, костюмчик, ботинки, портянки и грипп – это разве музыкальный репортаж? Тебе попросту надо было рекламу внимательнее читать: «222 альбома и свиной грипп уже в Минске? Зато ни одна свинья не придёт на концерт». А ты вот взял и пришёл в навозе поковыряться, где его сроду не бывало.

**editor для Ridera** 04.02.08, 14'10 – Клёва.

**kiss** 04.02.08, 16'42 – цунами в унитазе всё это %) и вот тут мнение http://www.livesound.by/news/525 *(**В.М.** Нейкі ананім спрабуе паказаць велічэзнасць нейкага унітазу? Дзіўная ганарлівасць).*

**человечек** 09.02.08, 17'03 – и вот тут мнение http://www.livesound.by/news/525 *(**В.М.** Як яны дружна падпяваюць адно аднаму, недаўзгодненыя змоўшчыкі! А мо тыя ж двурушнікі? Двуаблічныя Янусы! Ну як не падзякаваць нават ворагам сваім, як пісаў Караткевіч, што нам заснуць не даюць, дапамагаючы пісаць вось і гэтую кнігу. Кінуў вокам тыя спасылкі – бачу: нічога занадта страшкога. Проста недавучанае дзяўчо пыжыцца стаць журналісткай, пакуль ананімнай ад уласнага страху, але блытаецца па малалецтву ва ўласных жа сусьлях. Ні пра жанры журналістыкі,*

*ні пра стыль яна, відаць, нічога ня чула. Вось і атрымалася клясычная кляўза баявой шэрасьці ў форме рэпартажу з канцэрту, дзе рэцэнзуецца непрачытаная кніга. Ну што ж, дам бясплатны ўрок. Вы пішаце: **«В рецензии на дебютный диск "beZ bileta" – "На неба" (она есть во втором томе сборника "222 альбомаў") Мартыненка говорил, что одна-единственная песня этой группы – "Мая краіна – Беларусь" – достойна уважения, всё остальное – слабенько»**. Па-першае, адкуль вы накалупалі ў сваім тэксьце ажно тры тамы названай кнігі? Вы хоць бачылі тыя кнігі, пра якія ўзяліся пісаць? Ёсць толькі дзьве асобныя. А ў вас нешта накшталт «У другім томе "Братоў Карамазавых", які называецца "Ідыёт", Дасто́еўскі аўтар раптам разьлюбіў свайго падлетка Макара Даўгарукага». Вы прыпісалі мне словы, якіх я ня мог сказаць, бо і ў кнізе зусім іншыя высновы. Мо самі ведаеце ў абараняемага гурта толькі адну беларускую песьню? Дык жа, па-першае, названы альбом беларускі напалову, вы забыліся пра песьні "Прывітаньне", "Валадар", "Пад яліною", "Сьвяча", "Жалейка", "Споласк"; рэшта руска-польская. Па-другое, ніякага фальклёру ў згаданай вамі песьні няма. І ня трэба схематызаваць нармальных людзей пад пяюноў выключна фольку. Проста, рэцэнзуючы кнігу, разгарніце яе на стар. 120-122 – і ўсе вашыя высновы пэмкнулі. Далей, «в пример постоянно приводили...» ва ўсіх рэпартажах – Іскуі Абалян, а ў вас чамусьці – Гюнэш Абасаву. Што, чулі звон, ды не зразумелі, адкуль ён? Ці вам усе яны, беларускія зоркі-чужынцы кшталту Абасавых, Абалян, Майсурадзэ, «на одно лицо»? Маўляў, «ратуйце Абрама, а то Ёселя б'юць. Дзе? Ды нідзе, проста прысьнілася»... З падобнай журналістыкай так і застанецеся сецівамарацелем бясплатных сайтаў, якія наведваюць 2/3 сябрука ў месяц па асабістай просьбе аўтара за пляшку піва. Лепш задумайцеся, чаму павучаным вамі аўтарам за кнігу ня толькі заплацілі ганарар выдаўцы ды прызначылі прыз адмыслоўцы «Рок-Каранацыі», але і ў Інтэрнэце перавыдаўцы знайшліся, якія палічылі патрэбным пачаць размову таксама з прапановы чароднага ганарару. Найцікавейшае, што й тыя апошнія ня ў страце, бо абедзьве кнігі названых аўтараў у сталым рэйтынґу, што падвышае й рэйтынґ сайту (http://www.kamunikat.org). Але яшчэ больш жахлівыя для вашай журналісцкай будучыні вашыя ж высновы: «Другими словами, только исполнители, поющие на белорусском, могут называться нашими музыкантами». Ну вы загнулі!!! Нават у нашай кнізе нашы музыканты сьпяваюць і па-анґельску, як Ігар Варашкевіч у сваім брытанскім альбоме, і па-польску, як Лявон Вольскі ды Сяржук*

